

ПАВЕЛ СУХІ: ШЛЯХ ДА СУСВЕТНАЙ СЛАВЫ.

Сямейная газета

ЯК ПРАВІЛЬНА НАРЫХТАВАЦЬ БЯРОЗАВІК.



Сямейная газета


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 КРАСАВІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 63 (28930)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:**

*«Каля 700 тысяч беларусаў у 2019 годзе пройдуць аздараўленне з выкарыстаннем сродкаў рэспубліканскага бюджэту і фонду дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. На аздараўленне дзяцей будзе накіравана каля 80 % выдзеленага аб'ёму фінансавання. У летніках рознага тыпу адпачне больш за 390 тысяч дзяцей. Першачарговае права на бясплатныя пуцёўкі дадзена ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і асобам, якія да іх прыраўнаныя. Яны могуць штогод адпачываць у санаторыях, інваліды I—II груп — раз у два гады. Акрамя таго, атрымаць санаторна-курортнае лячэнне з частковай аплатай могуць працуючыя грамадзяне. На адпачынак беларусаў запрашаюць і ў здраўніцы, якія знаходзяцца ва ўласнасці Беларусі ў Сочы, Юрмале, Друскінінкаі, Туапсэ, Місхоры».*

# ВЯСНОВЫ КЛОПАТ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рабочыя «Зялёнгаса» Савецкага раёна Мінска абразаюць дрэвы на вуліцах сталіцы.

## КОРАТКА

- Указам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўстаноўлены юбілейны медаль «75 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».
- **На сесіі Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў зацверджана на пасадзе старшыні аблвыканкама кандыдатура Леаніда Зайца. Таксама быў прадстаўлены памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Міхаіл Русы.**
- БЧ: білеты з электроннай рэгістрацыяй можна будзе купіць і пасля адпраўлення цягніка.
- **У Беларусі на 1 сакавіка зарэгістравана 21 160 ВІЧ-інфіцыраваных.**


ISSN 1990 - 763X


Спецыяльны рэпартаж

# ВАНДРОЎКА ПА ЭНЕРГЕТЫЧНЫМ АЎТАБАНЕ

Нулявы электракіламетр, вада для атамнага рэактара і ўранавыя таблеткі

**Адкуль бярэцца ядзернае паліва, як робяць ваду для ахаладжэння энергаблока і навошта Беларускай атамнай электрастанцыі лавушка расплаву. Пра ўсё гэта і шмат што іншае журналісты даведаліся на экскурсіі па АЭС, дзе яны ўгледзелі разрэз трубаправоду на рэактары і ліквідацыю аварыі... у камп'ютарнай версіі. Арыгінальнае падарожжа зладзіла Мінэнерга.**

### 1000 кіламетраў пад напружаннем 330 тысяч вольт

На свае вочы пабачыць, што адбываецца на самай вялізнай будоўлі ў Еўропе, а таксама даведацца пра меры бяспекі на станцыі, першы рэактар якой будзе запушчаны сёлета, — магчымасць, ад якой не адмаўляюцца. Тым больш што трапіць на АЭС без спецыяльнага пропуску неўзабаве будзе ўжо немагчыма.

Вакол АЭС збудавана высакавольтная інфраструктура, якая гатовая прыняць энергію. Працуюць трансфарматары і камплектнае размеркавальнае ўстройства элегазавае (КРУЭ), якое летась у снежні падключылі да напружання ад падстанцыі «Паставы». Пакуль яна адзіная з сямі ўведзена ў строй. Электрычнасць прымаюць звонку для сілкавання ўласных патрэб станцыі. Уласную энергію яна, зразумела, пакуль яшчэ не генерыруе.

СТАР. 4

Размова па сутнасці

# АД МОВЫ ДА НЕСУПЯРЭЧЛІВАЙ ГІСТОРЫІ

Гаворым аб Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі з адным з яе аўтараў



**Нядаўна Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў маштабны дакумент — Канцэпцыю інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (друкавалася ў «Звяздзе» 26.03.2018). Над ім працавалі спецыялісты амаль з 20 дзяржаўных органаў і арганізацый — сродкаў масавай інфармацыі, навуковых устаноў, парламента. Адным з распрацоўшчыкаў канцэпцыі стаў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК. Член-карэспандэнт НАН, доктар гістарычных навук, прафесар упэўнены: новая канцэпцыя абараняе канстытуцыйнае права на аб'ектыўную і праўдзівую інфармацыю.**

СТАР. 13

Парламенцкі дзённік

# Умацаванне традыцыйна добрых адносін

**На адкрыцці шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання прысутнічала парламенцкая дэлегацыя з Кітая на чале з намеснікам старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў, старшынёй Усекітайскай федэрацыі жанчын ШЭНЬ Юэюэ.**

Перад гэтым з кітайскімі калегамі сустрэўся **кіраўнік ніжняй палаты беларускага парламента Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**

Адносіны паміж Беларуссю і Кітаем дынамічна развіваюцца, дзякуючы найперш палітычнай волі і выдатным адносінам паміж лідарамі дзяржаў, упэўнены ён.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу на эканамічныя поспехі КНР, унутраны валавы прадукт якой за мінулы год склаў больш за 13,5 трыльёна долараў. «Гэта сур'ёзны падарунак да 70-годдзя ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі, якое вы будзеце адзначаць у кастрычніку, і сведчанне таго, што Кітай з'яўляецца адной з вядучых дзяржаў свету», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Спікер Палаты прадстаўнікоў адзначыў прадукцыйнае развіццё міжпарламенцкіх адносін паміж дзвюма краінамі, створаную для гэтага неабходную нарматыўную базу, дзейнасць рабочых груп, рэгулярны абмен візітамі. Ён перадаў цёплае прывітанне старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Лі Чжаньшу і запрашэнне наведаць нашу краіну ў любы зручны для яго час.

«Мы лічым вельмі важным ваш візіт у Рэспубліку Беларусь, які паслужыць умацаванню і развіццю нашых міжпарламенцкіх адносін ва ўсіх сферах: палітычнай, эканамічнай, гандлёвай, сацыяльнай, экалагічнай. Бо менавіта такія задачы ставяць перад намі кіраўнікі нашых дзяржаў. А задача ў нас агульная: павышэнне дабрабыту людзей і рэалізацыя ініцыятывы «Адзін пояс — адзін шлях», — звярнуўся Уладзімір Андрэйчанка да кітайскіх гасцей.

У сваю чаргу кіраўнік кітайскай дэлегацыі пацвердзіла наладжванне шчырага сяброўства і добрага партнёрства паміж дзвюма краінамі. «Кітайскі бок аддае павышаную ўвагу развіццю сяброўскіх адносін з Беларуссю, мы гатовы рабіць сумесныя з беларускімі калегамі намаганні для няспыннага ажыццяўлення дамоўленасцяў нашых лідараў, — запэўніла Шэнь Юэюэ. — Супрацоўніцтва па лініі парламентаў — адзін з самых важных складнікаў двухбаковага ўзаемадзеяння».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Факт

## На спартыўных аб'ектах інтэрнэт будзе «лятаць»

**Да верасня МТС павялічыць ёмістасць 4G-сеткі ў паўтара раза.**

Новыя вышкі сувязі запрацуюць у буйных гарадах і райцэнтрах краіны. Зараз у Беларусі дзейнічае больш за 1600 базавых станцый LTE, а да канца года іх будзе больш за 2400. З павелічэннем ёмістасці павысіцца і прапускная здольнасць 4G-сеткі.

Частка новых базавых станцый будзе запушчана яшчэ да пачатку Еўрапейскіх гульняў, якія пройдуць у краіне з 21 да 30 чэрвеня. Найбольш шчыльнае 4G-пакрыццё будзе арганізавана ў Мінску. Для лепшай якасці LTE-сетка ўжо цяпер працуе ў двух частотных дыяпазонах — 1800 і 2600 МГц. У месцах правядзення спартыўных мерапрыемстваў сувязь будзе дадаткова ўзмоцнена, каб забяспечыць высокую хуткасць доступу ў інтэрнэт для вялікай колькасці абанентаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Трамп плануе выкарыстаць адразу два слоганы на выбарах у 2020 годзе



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп разважае над выкарыстаннем адразу двух слоганаў падчас прэзідэнцкай кампаніі ў 2020 годзе. Амерыканскі лідар расказаў пра гэта на вечары ў вашынгтонскім Нацыянальным будаўнічым музеі. Яго словы перадае прэс-пул Белага дома.

Прэзідэнт падкрэсліў паспяховасць слогана «Зробім Амерыку зноў вялікай», які ён выкарыстаў на прэзідэнцкай кампаніі ў 2016 годзе. «Многія людзі лічаць, што, магчыма, гэта было найвялікшым лейтматывам у палітыцы», — адзначыў ён.

Гаворачы аб прэзідэнцкай кампаніі ў 2020 годзе, Трамп спачатку разважаў над тым, каб выкарыстоўваць новы слоган «Захаваем Амерыку вялікай», таму што яго адміністрацыя «ўжо зрабіла яе вялікай». Затым ён папрасіў прысутных у зале з дапамогай апладысментаў паказаць, які з двух слоганаў ім больш падабаецца. «Вынікі галасавання» прэс-пул Белага дома назваў непераканаўчымі.

«Мы вызначымся», — падкрэсліў прэзідэнт, дадаўшы, што яму падабаюцца абодва слоганы.

«У экс-кандыдата ў прэзідэнты ЗША Хілары Клінтан было нешта накшталт: «Трымаемся разам» або нейкая іншая лухта», — сказаў Трамп. Ён пажартаваў, што былая першая лэдзі нібыта заплаціла «аднаму разумніку» за гэты слоган $1,9 млн. Пры гэтым Трамп заявіў, што сам прыдумаў слоган для сваёй кампаніі.

Старт перадвыбарнай кампаніі ў ЗША будзе дадзены ў лютым 2020 года.

### Патанулыя ў Другую сусветную вайну ў водах Балтыкі караблі пагражаюць экалогіі

Вярхоўная кантрольная палата Польшчы выказала занепакоенасць у сувязі з глабальнай пагрозай экалогіі, якую ўяўляюць сабой патанулыя ў перыяд Другой сусветнай вайны ў польскіх водах Балтыйскага мора караблі. Згодна з падлікамі экспертаў, такіх судоў на дне мора каля 300, у тым ліку, па меншай меры, сотня — у Гданьскім заліве.

Рэальную небяспеку ўяўляюць сабой два нямецкія караблі — «Штутгарт» і «Франкен». З першага ўжо выцякае паліва, а другі — загружаны хімікатамі танкер — неўзабаве стане ахвярай каразіі, што можа пацягнуць за сабой экалагічную катастрофу.



Па словах кіраўніка Вярхоўнай кантрольнай палаты Кшыштафа Квяткоўскага, калі адбудзецца ўцечка хоць бы шостай часткі хімікатаў, гэта заб'е жыццё ў Балтыйскім моры на 100 гадоў. У красавіку мінулага года стан танкера даследавалі ўдзельнікі спецыяльнай экспедыцыі, якая складалася з вучоных і аквалангістаў. Па іх ацэнцы, уцечка паліва на «Франкене» пачнецца ў найбліжэйшы час.

### Памёр акцёр Аляксей Булдакоў



Народны артыст Расіі Аляксей Булдакоў, выканаўца многіх характарных роляў, памёр учора ва ўзросце 68 гадоў, паведамілі ТАСС у прэс-службе Гільдыі акцёраў кіно Саюза кінематаграфістаў РФ.

«Аляксей Іванавіч Булдакоў памёр, падрабязнай інфармацыі ў нас няма, ведаем толькі, што ён быў на гастролях, у яго адарваўся тромб», — сказаў суразмоўнік ТАСС.

Аляксей Булдакоў нарадзіўся ў 1951 годзе ў вёсцы Макараўка Алтайскага краю. У 1969 годзе ён скончыў Маладзёжную тэатральную студыю пры Паўладарскім драматычным тэатры імя А. П. Чэхава. Затым працаваў у тэатрах Паўладара, Томска, Караганды, Разані. У 1985—1992 гадах Булдакоў быў акцёрам Тэатра-студыі кінаакцёра пры кінастудыі «Беларусьфільм» у Мінску.

У кінематографе Аляксей Булдакоў дэбютаваў у 1982 годзе ў фільме «Скрозь агонь». Затым ён зняўся ў некалькіх дзясятках карцін і тэлесерыялаў, аднак па-сапраўднаму знакамітым стаў пасля фільма Аляксандра Рагожкіна «Асаблівасці нацыянальнага палявання», дзе сыграў ролю генерала Івалгіна. За яе акцёр быў узнагароджаны кінапрэміяй «Ніка». Пазней у тыпажнай ролі генерала Аляксей Булдакоў выступіў у фільмах «Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі» і «Асаблівасці нацыянальнага палявання ў зімовы перыяд».

Пасля «Вялікай размовы»

# МАБІЛЬНІКІ, ТУРНІКЕТЫ І... ШКОЛЬНЫЯ «ПАБОРЫ»

Два гады таму **бацькоўскім камітэтам ва ўстановах адукацыі афіцыйна забаранілі збіраць наяўныя грошы. Але непрыемная тэма школьных «пабораў» не знікла. Адно з пытанняў, што паступіла ў рамках правядзення «Вялікай размовы з Прэзідэнтам», зноў узняло гэту праблему.** *«У апошні час пастаянна збіраюць грошы то на вокны, то на ўстаноўку турнікетаў, то на дапаможнікі. Як даведацца, што фінансуе школам дзяржава, а што можа быць зроблена толькі за кошт сродкаў бацькоў пры іх жаданні?»* — запыталася Марыя Лісатовіч з аграгарадка Сеніца Мінскага раёна.

У Міністэрстве адукацыі растлумачылі, што фінансаванне расходаў на ўтрыманне ўстаноў дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, сродкаў заснавальнікаў, сродкаў, атрыманых ад дзейнасці, якая прыносіць даходы, безвыплатнай (спонсарскай) дапамогі юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам (артыкул 137 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі). Абнаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы адукацыі забяспечвае яе заснавальнік. Магчымы ўдзел бацькоў (законных прадстаўнікоў) навучэнцаў (выхаванцаў) ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі рэгламентуецца палажэннем аб папячыцельскім савеце ўстановы адукацыі (дакумент зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25.07.2011 г. № 146).

На падставе пункта 24 згаданага палажэння грашовыя сродкі, накіраваныя ў распараджэнне папячыцельскага савета, фарміруюцца з добраахвотных пералічэнняў (узносаў) фізічных асоб, якія залічваюцца на бягучы (разліковы) рахунак па ўліку пазабюджэтных сродкаў установы адукацыі. Грашовыя сродкі выкарыстоўваюцца па мэтавым прызначэнні ў адпаведнасці з рашэннем папячыцельскага савета, узгодненым з кіраўніком установы адукацыі і бацькоўскім камітэтам установы адукацыі (пры яго наяўнасці). «Такім чынам, для вырашэння актуальных задач установы адукацыі яе кіраўнік ва ўзаемадзеянні з папячыцельскім саветам мае права прыцягваць дадатковыя крыніцы фінансавання, у тым ліку сродкі бацькоў (законных прадстаўнікоў), але пры гэтым дадзеная дапамога можа аказвацца толькі на добраахвотнай аснове», — падкрэсліваюць у міністэрстве.

Адразу два пытанні, што паступілі на гарачую лінію напярэдадні «Вялікай размовы з Прэзідэнтам», датычыліся з'яўлення ва ўстановах адукацыі турнікетаў: *«Чаму ў краіне масава і ў прымусовым парадку ўстанаўліваюць турнікеты ў школах? Як гэта звязана з бяспекай дзяцей? І ці не будзе паўтарэння трагедыі на Нямізе?»*

У галоўным адукацыйным ведамстве краіны сцвярджаюць, што ўстаноўка турнікетаў дазваляе правільна арганізаваць праход вялікай колькасці навучэнцаў у будынак школы і выхад з яго, а таксама знізіць выдаткі ўстановы адукацыі на ахову будынка. Арганізацыя аховы з дапамогай фізічных асоб абыходзіцца даволі дорага.

Разам з тым няма ні аднаго нарматыўнага прававога акта, які б прадпісваў забяспечваць бяспеку ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі шляхам абавязковай устаноўкі турнікета. Але калі магчымасці школы дазваляюць, то ўстаноўка турнікетаў вітаецца. Дзякуючы ім у будынак не зойдзе звычайны чалавек. Акрамя таго, яны зручныя тым, што дазваляюць весці дакладны ўлік наведвання школы навучэнцамі, у тым ліку хутка ўстанавіць факт прысутнасці (адсутнасці) вучня ў школе, час яго выхаду і іншыя абставіны, якія наўпрост звязаныя з бяспекай дзяцей.

Устаноўка электронных турнікетаў з'яўляецца адным з элементаў праекта «Электронная школа», рэалізацыя якога ў перспектыве дасць магчымасць забяспечыць не толькі бяспеку ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, але і збор вялікага масіву іншай інфармацыі, якая адносіцца да адукацыйнага і іншых працэсаў.

У Міністэрстве адукацыі звяртаюць увагу на тое, што да турнікета прад'яўляюцца пэўныя патрабаванні. Для таго каб дзеці і персанал змаглі без праблем пакінуць будынак школы ў выпадку надзвычайнага здарэння, на ўстройстве павінна быць рэжым «Антыпаніка». А для захавання неабходнай шырыні прахода (не меней 1200 мм) побач з турнікетам звычайна ўсталёўваюць лёгказдымныя агароджы або аўтаматычныя брамкі, якія па сігнале з кантрольнага прыбора пажарнай сігналізацыі аўтаматычна адчыняюцца. Акрамя таго, механізм усталёўваецца ў вестыбюлі, а не на шляхах эвакуацыі людзей з будынка.

*А Валерый Арцімовіч з Навагрудка пацікавіўся ўвядзеннем забароны на карыстанне мабільнымі тэлефонамі ва ўстановах адукацыі.* Як высветлілася, пакуль такой забароны няма і нарматыўнымі прававымі актамі карыстанне мабільнымі тэлефонамі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі не рэгламентуецца. Але Міністэрства адукацыі прапрацоўвае пытанне аб увядзенні абмежавання на выкарыстанне навучэнцамі сродкаў мабільнай сувязі ў час адукацыйнага працэсу ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з 1 верасня 2019 года.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

Сталічны ЧАС

• Каля 1 мільёна кв. метраў пакрыццяў на вулічна-дарожнай сетцы плануецца адрамантаваць сёлета ў Мінску, паведаміў галоўны інжынер прадпрыемства «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» Яраслаў Паўлоўскі ў прэс-цэнтры БелТА. Усяго на абслугоўванні прадпрыемства знаходзіцца каля 24 млн кв. метраў пакрыццяў вуліц. «Па выніках 2018 года, выкананы бягучы рамонт больш чым на 1 мільёне квадратных метраў. Такія ж планы захоўваюцца на гэты год. Ямачны рамонт ужо завершаны прыкладна на 50 тысячах квадратных метраў. Работы вядуцца ў кругласутачным рэжыме, задзейнічана больш за 20 брыгад», — адзначыў Яраслаў Паўлоўскі. Ліквідаваць ямачнасць дарожнікі павінны да 1 мая. Па словах Яраслава Паўлоўскага, гарантыйны тэрмін на асфальтабетоннае пакрыццё складае 5—7 гадоў. У апошнія гады ў горадзе сталі актыўна ўжываць пакрыцці падвышанай дэфармацыйнай устойлівасці, ахоўныя пласты. Галоўны інжынер «Гаррамаўтадара» адзначыў, што інтэнсіўнасць руху ў сталіцы вырасла ў разы. Напрыклад, праектная нагрузка на Мінскую кальцавую аўтадарогу складае 20 тысяч аўтамабіляў у суткі, а па факце сёння па ёй штодня праязджаюць 70—80 тысяч машын.

• Сельгаспрадпрыемствы і арганізацыі Мінска актыўна праводзяць сяўбу ранніх яравых збожжавых і зернебабовых культур. Пра гэта агенцтву «Мінск-Навіны» паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама. Работы пачаліся ўжо ў 19 з 27 гаспадарак. У гэтым годзе сталічныя аграрыі плануюць засеяць яравымі культурамі 32,9 тысячы гектараў, у тым ліку 17,4 тысячы гектараў зоймуць збожжавыя і зернебабовыя, 14,3 тысячы гектараў — кукуруза, 524 га — бульба і агародніна, больш 680 га — тэхнічныя, кармавыя і іншыя культуры.

Блізкая ўлада

# УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД КАДРАЎ

## Пры разглядзе зваротаў трэба ставіць сябе на месца заяўніка

**Дзяржаўным служачым трэба ставіцца да праблем людзей як да сваіх, ставіць сябе на іх месца. Такую выснову агучыў памочнік Прэзідэнта Беларусі Аляксандр КОСІНЕЦ па выніках амаль пяцігадзіннага прыёму грамадзян у Барысаўскім райвыканкаме.**

Як паведамляе БелТА, усяго было разгледжана 18 заяў, у тым ліку шэсць без папярэдняга запісу. Сярод пытанняў у асноўным жыццёвыя: рамонт жылля і дарог, самавольнае будаўніцтва, вода- і цеплазабеспячэнне дамоў, добраўпарадкаванне двароў, аказанне медыцынскай дапамогі, садзейнічанне занятасці і пенсійнае забеспячэнне, а таксама праблемы прыватнага парадку, канфлікты паміж суседзямі. Некаторыя грамадзяне прыйшлі па дапамогу ў вырашэнні асабістых пытанняў: паспрыяць вяртанню грошай за набыты пыласос, дапамагчы з залічэннем у працоўны стаж няўлічанай вайсковай службы. Была і скарга на наймальнікаў, якія не працягнулі кантракт без аб'ектыўнай прычыны.

Аляксандр Косінец спагадліва ставіўся да праблем заяўнікаў і даваў парады, перанакіроўваў у кампетэнтныя органы, тлумачыў парадак дзеянняў. Асобную ўвагу памочнік Прэзідэнта звярнуў на сітуацыю на рынку працы Барысава ў цэлым.

«Амаль ніводнага пытання ўзроўню памочніка Прэзідэнта не было, — рэзюмаваў вынікі прыёму Аляксандр Косінец. — На месцах усё залежыць ад кадраў. Разглядаючы любое пытанне, трэба ставіць сябе на месца чалавека. Там, дзе трэба дапамагчы, — дапамагаць, дзе падказаць, — падказваць. І не дапускаць канфліктных сітуацый.

Між іншым, прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі падчас планавых выязных прыёмаў грамадзян у рэгіёнах правяраюць, як мясцовыя ўлады вырашаюць пытанні, накіраваныя падчас акцыі «Ваша пытанне Прэзідэнту» пры падрыхтоўцы і правядзенні «Вялікай размовы з Прэзідэнтам». Ёсць магчымасці звярнуцца да прадстаўнікоў Адміністрацыі 4 і 5 красавіка ў жыхароў Драгічынскага, Мазырскага, Сенненскага, Астравецкага і Дрыбінскага раёнаў. Пазней выязныя прыёмы працягнуцца.

# У ДАПАМОГУ ЧАЛАВЕЧАМУ ФАКТАРУ

## Распрацоўкі беларускіх вучоных накіраваны на тое, каб знізіць да мінімуму негатыўны ўплыў надвор'я на ўраджай

**На палетках краіны хутка з'явіцца не толькі трыцікале, з якога можна пячы «шэры» хлеб, але і цвёрдазерневыя сарты пшаніцы, прыгодныя для вырабу макароны. Да гэтага імкнуцца супрацоўнікі навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве. Як паведаміў намеснік генеральнага дырэктара па навуцы Дзмітрый ЛУЖЫНСКІ, да новай пасяўной аграрыям прапануецца больш за сорак новых сартоў: азімы рапс, азімая і яравая пшаніца, яравы ячмень — піваварны і кармавы, грэчка, зернебабовыя, шматгадовыя травы.**

Акрамя таго, навукоўцы ўдасканальваюць тэхналогію апрацоўкі сельскагаспадарчых культур — перш за ўсё падбарам аптымальных доз угнаенняў. Аптымізаваць прымяненне пестыцыдаў дапамагаюць, з аднаго боку, замена іх на біялагічныя, а з другога — дасягненні селекцыі, што забяспечваюць павышаную ўстойлівасць да хвароб і шкоднікаў.

У навукова-практычным цэнтры актывізуюць работу з цеплалюбівымі і засухаўстойлівымі культурамі сорга і просам, аптымізуюць сартавы склад па кукурузе і іншых кармавых культурах. На сельгаспрадпрыемствах вытворчасць уласнага кармавога збожжа дазволіць папоўніць запасы кармоў — залогу поспеху жывёлагадоўлі.

Якасных кармоў без бялку не будзе, падкрэсліў Дзмітрый Лужынскі, і гаспадаркі могуць вырасціць якасныя, збалансаваныя кармы. У Беларусі для атрымання збожжа і зялёнай масы прыгодны шырокі спектр сартоў гароху і лубіну. А вось соя пакуль што не атрымала распаўсюджання.

Беларускія сарты азімага трыцікале ўжо прыдатныя да кандытарскіх вырабаў. Якасць збожжавых будуць павышаць да ўзроўню хлебапячэння. Узоры ўжо маюцца, і можна атрымаць «шэры» хлеб. У Беларусі такі «канкурэнт» пшаніцы быў бы вельмі актуальны, бо для апошняй у нас мала спрыяльных глебаў, і харчовая фракцыя збожжа значна б павысілася.

Стабільнасць і павышэнне прадукцыйнасці агракомплексу залежыць у першую чаргу ад урадлівасці глебы. **Дырэктар інстытута глебазнаўства і аграхіміі Нацыянальнай акадэміі навук Віталь ЛАПА** адзначыў, што за апошнія дзесяцігоддзе адпаведныя аграхімічныя паказчыкі значна палепшыліся, упершыню за чатыры гады назіраецца станоўчы баланс гумусу. Высокую ўрадлівасць гарантуе захаванне прадукцыйнасці амаль усіх культур пры неспрыяльных умовах надвор'я.

На сёння галоўныя задачы — своечасова правесці ранняю падкормку азімых і ўнесці неабходныя дозы мінеральных угнаенняў. Ва ўсіх гаспадарках ёсць адпаведныя планы па забеспячэнні збалансаванага мінеральнага харчавання. Віталь Лапа падкрэсліў: эканоміць на фосфары нельга, не атрымаецца замяніць яго нястачу лішкам, напрыклад, калію.

У інстытуце распрацаваны 84 новыя формы комплексных угнаенняў для ўсіх культур, якія вырошчваюцца ў Беларусі. Найбольш запатрабаваныя комплексы вытворчасці Гомельскага хімічнага завода пад лён, азімы рапс і цукровыя буракі.

У навукова-практычным цэнтры НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі распрацаваны неабходныя машыны для ўзворвання і культывацыі, камбінаваныя агрэгаты рознага назначэння.

Распрацаваны 12-корпусны плуг, сеялкі шырынёй дзевяць метраў, павышаецца камбінаванасць машын. Напрыклад, сучасныя глебаапрацоўчыя агрэгаты не толькі сеюць, але і ўносяць стартавыя дозы мінеральных угнаенняў», — паведаміў **вучоны сакратар Юрый САЛАПУРА.** Распрацаваны ў цэнтры і транспартныя сродкі, прычэпы розных мадэляў. Завяршаецца стварэнне транспартна-тэхналагічнай сістэмы грузападымальнасцю 25 тон для ўнясення мінеральных угнаенняў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# Узнагароджаны пераможцы конкурсу перакладаў Максіма Багдановіча

**Пераможцаў конкурсу на самы лепшы пераклад з рускай мовы на беларускую раней невядомага верша Максіма Багдановіча «Дистихи» ўшанавалі ў Мінску. Найлепшай з больш чым 440 дасланых работ журы назвала работу Маі Галіцкай з Буда-Кашалёва.**



Фота БелТА.

Надзея ЛАЗЕРКА, Віктар ЛОЎГАЧ, Мая ГАЛІЦКАЯ.

Другое і трэцяе месцы ў літаратурным конкурсе занялі мінчанін Віктар Лоўгач і Аксана Гаўрылік з аграгарадка Ілья Вілейскага раёна, дадатковы заахвочвальны прыз атрымала таксама Надзея Лазерка з Барысава. Усе прызёры атрымалі падарункі ад Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы — камплекты кніг, якія дададуць разнастайнасці дамашняй бібліятэцы любога аматара літаратуры.

«Сярод заявак, якія прыйшлі з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Расіі, пераважная большасць ад прыгожай паловы чалавецтва, — адзначыла **старшыня журы, генеральны дырэктар БелТА Ірына АКУЛОВІЧ.** — Але што спадабалася асабіста мне, гэта вялікая колькасць зусім юных аўтараў, 16—18 гадоў. Моладзі было цікава, як загучыць рускамоўны верш Максіма Багдановіча на беларускай мове, і гэта цудоўна».

Нагадаем, раней невядомы твор Максіма Багдановіча быў знойдзены ў лістападзе мінулага года ў студэнцкім сшытку класіка ў архівах Інстытута сусветнай літаратуры Расійскай акадэміі навук. Верш «Дистихи» запісаны ў сшытку на рускай мове, і, хоць сам Максім Багдановіч пазначыў, што гэта пераклад з беларускай, арыгінал нідзе і ніколі не быў выяўлены. Па ініцыятыве дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора Рапоты быў зладжаны адмысловы праект— конкурс на самы лепшы пераклад знойдзенага верша, арганізатарамі якога выступілі Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы, Беларускае тэлеграфнае агенцтва, расійскі Інстытут сусветнай літаратуры імя Максіма Горкага, літаратурны музей Максіма Багдановіча і Саюз пісьменнікаў Беларусі.

**Дистихи**

*Правда, и черные дни сплеталися с ясными днями,*
*Но далеко уж они в прошлое все отошли.*
*Всех я теперь их люблю, — ведь издали кажется сердцу,*
*Словно узорная чернь по серебру пролегла.*

**Максим Богданович.**

**Пераклад Маі Галіцкай:**

*Праўда, маркотныя дні з яснымі браліся днямі,*
*Мне іх цяпер не відаць — усе ў нябыт адышлі.*
*Іх прыгарну да сябе, бо сэрцу здалёк падалося,*
*Нібы чарнёным узорам па срэбры сноўцца сляды.*

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# СПІС БЕЗРЭЦЭПТУРНЫХ ЛЕКАЎ ЗМЕНШЫЛІ

**Мінздраў падрыхтаваў праект новага пераліку безрэцэптурных лекавых сродкаў. І без таго кароткі іх спіс значна змяншыўся.**

— Адно са знакавых змяненняў — **ліквідаванне нормаў водпуску** лекавых сродкаў, якія былі ўведзены ў 2012 годзе: не больш за 50 доз таблетак, дражэ, капсул, пасцілак, гранул, парашкоў ці не больш за адну ўпакоўку, якая змяшчае 50 доз, і не больш за дзве ўпакоўкі іншых лекавых формаў, — адзначае **начальнік упраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння Наталля МАЛАШКА.** — Нормы водпуску захаваліся толькі для асобных прэпаратаў: спірта- і фенабарбіталзмяшчальных (карвалол, настойка глогу, валяр'яну і інш.), леванаргестрэлуміфепрыстону, перманганату калію.

Затое цяпер па рэцэпце будуць прадаваць большасць ін'екцыйных сродкаў, уключаючы алфлутоп, актавегін, солкасерыл і лідакаін.

Рэцэптурнымі стануць таксама глюкакортыкастэроіды для інгаляцыйнага і інтраназальнага прымянення. У спісе — і камбінаваныя аральныя кантрацэптывы, за выключэннем сродкаў для экстраннай кантрацэпцыі. Па рэцэпце будуць прадаваць і інгібітары 5-альфа-рэдуктазы (фінастэрыд і дутастэрыд). Спатрэбіцца рэцэпт і для некаторых імпартных вочных кропляў, якія з'яўляюцца спалучэннем антыбактэрыяльнага кампанента з глюкакортыкастэроідамі і не маюць айчынных аналагаў.

Скарацілі і пералік безрэцэптурных антыбіётыкаў. Цяпер без паходу да ўрача можна будзе набыць толькі амаксіцылін, а таксама яго ж з дабаўленнем клавуланавай кіслаты, ампіцылін і дaксіцыклін.

— Рашэнне аб водпуску па рэцэпце большасці ін'екцыйных прэпаратаў абумоўлена тым, што пачасціліся выпадкі сур'ёзных непажаданых рэакцый — аж да анафілактычнага шоку, — растлумачыла Наталля Малашка.

Калі новая рэдакцыя ўступіць у сілу, пакуль невядома.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Мільён кветак для сталіцы

**Жыллёва-камунальная гаспадарка Мінска да II Еўрапейскіх гульняў высадзіць у горадзе 1 мільён штук кветкавай расады, 1,5 тысячы дрэў і больш за 10 тысяч квітнеючых кустоў, паведамілі журналістам у аддзеле па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка».**

Стварацъ зялёны дызайн сталіцы па сваіх праектах будуць жыллёвыя службы ўсіх раёнаў. Горад упрыгожаць хваёвыя і ліставыя расліны, вертыкальныя клумбы з рознакаляровай петуніі, разнастайныя вулічныя вазоны. У Цэнтральным раёне аформяць кампазіцыі з выкарыстаннем туі і хосты. На вуліцах Энгельса і Маркса, праспекце Незалежнасці высадзяць блакітныя елкі і спірэі. Каля пляцовак спаборніцтваў будуць прымяняць вертыкальнае азеляненне. На вуліцы Драздовіча з'явіцца жывая агароджа з кустоў ярка-жоўтай фарзіцыі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ВАНДРОЎКА ПА ЭНЕРГЕТЫЧНЫМ АЎТАБАНЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


Праца на АЭС кіпіць.

— З 2014-га да 2018 года падчас рэалізацыі гэтага праекта, які складаўся з 23 пускавых комплексаў агульным коштам 340 мільёнаў долараў, было збудавана больш за 1000 кіламетраў ліній напружаннем 330 тысяч вольт, — расказаў **Аляксандр МАЛЬКОЎ, начальнік інфармацыйна-аналітычнага аддзела.** — А КРУЭ атамнай станцыі — гэта своеасаблівы лагістычны цэнтр, з якога выпрацаваная энергія будзе па размеркавальных устройствах паступаць у энергасістэму.

КРУЭ — гэта своеасаблівы «нулявы электракіламетр». Праект выдачы магутнасці АЭС параўноўваюць з энергетычным аўтабанам, па якім вось-вось памчыцца электрычнасць.

На першым энергаблоку станцыі поўным ходам ідуць будаўніча-мантажныя работы і праводзіцца добраўпарадкаванне. У канцы красавіка тут павінны скончыць зборку рэактара. На другім — манціруецца абсталяванне. У найбліжэйшых планах на першым энергаблоку гідравыпрабаванні і халодная абкатка з далейшай праверкай абсталявання. Пасля ў рэактар загрузяць паліва і падключаць энергаблок у сетку, паведаміў **Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі**:

— Запуск такога механізма, як атамная станцыя, з дакладнасцю работы швейцарскага гадзінніка патрабуе вялікіх кампетэнцый і ведаў, цягне за сабой з'яўленне многіх рабочых пытанняў, якія ўносяць карэктывы ў нашы планы. Завоз паліва — не самамэта, аднак гэта ўжо зусім іншы рэжым працы. Нам дастаткова завесці яго за месяц да выхаду на фініш. Тым больш што паліва ўжо гатовае.

### Стрыжні кіравання і абароны

Калі нешта не можа здарыцца, рыхтуйся да гэтага акурат цяпер, кажуць атамшчыкі, апісваючы сістэму абароны аб'екта. Ядзерныя рэактары знаходзяцца ў спецыяльным будынку або ў гермаабалонцы. Збудаванне вышынёй 70,2 метра і дыяметрам 44 метры мае двайную ахоўную абалонку. Дадатковае ўзмацненне надае сістэма пераднапружвання бетону, якая дазваляе будынку захоўваць герметычнасць нават пры ўнутраным ціску пяць атмасфер. Нават калі здарыцца неверагоднае, і ў выніку аварыі днішча рэактара расплавіцца, радыеактыўныя рэчывы трапяць не ў наваколле, а ў спецыяльнае прыстасаванне, якое знаходзіцца пад рэактарамі, — лавушку расплаву, запэўніваюць спецыялісты.

Ядзернае паліва — гэта канструкцыя з тоненькіх трубачак — цеплавыдзяляльных элементаў, якія зроблены са сплаву цырконію. Унутры трубачак — уранавыя паліўныя таблеткі вагой 5 грамаў, кожная з якіх замяняе 350 літраў нафты па сваёй цеплаёмістасці. У адной цеплавыводзячай зборцы (ЦВЗ) або касеце такіх таблетак больш за 18 мільёнаў.

— Мы будзем купляць не ўран, а паліва ў выглядзе цеплавыдзяляючых зборак. Для кожнага рэактара патрэбны 163 ЦВЗ, — паказаў макет канструкцыі **Эдуард СВІРЫД, начальнік аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў Беларускай АЭС.** — Касета са свежым ядзерным палівам бяспечная для чалавека, бо ўсе небяспечныя рэчывы пачынаюць выпраменьвацца толькі пасля таго, як становяцца актыўнымі ў рэактары. Унутры касеты знаходзяцца стрыжні кіравання і абароны. Пакуль яны ўнутры зборак, стрыжні паглынаюць усе нейтроны і дзялення ўрану не адбываецца. Калі стрыжні падняць угору, нейтроны запусцяць ядзерную рэакцыю і паліва разагрэецца да 1200 градусаў. Каб спыніць рэакцыю, стрыжні трэба перавесці ўнутр ЦВЗ. У падвешаным стане яны ўтрымліваюцца з дапамогай электрамагнітаў, і нават калі не будзе электраэнергіі, стрыжні пад уздзеяннем уласнай вагі апусцяцца ўніз і рэакцыя затухне, энергаблок спыніцца.


Цеплавыводзячая зборка з ядзерным палівам.

Як гэта працуе, паказалі на спецыяльнай камп'ютарнай праграме.

### Вілейскі ласось і пырскальны басейн

Для патрэб АЭС неабходна 12 000 кубаметраў вады, якую дае станцыі рака Вілія. Як выглядае водазабор глыбінёй восем метраў, нам таксама паказалі і запэўнілі, што дамбу на рацэ не будавалі. Так што гэта ніяк не замінае жыццю асятра і ласося, якія плывуць сюды на нераст з Балтыкі.

— Вада ідзе ў водазаборны коўш, дзе знаходзяцца водазаборныя сеткі, якія не даюць смеццю і рыбе трапіць у насосную станцыю. Па трох вадаводах дыяметрам 1000 міліметраў вада ідзе на насосную станцыю першага пад'ёму. Тут вада праходзіць першую ачыстку. Далей насосамі яна каскадна падаецца на станцыю другога пад'ёму. Пасля такім жа каскадным чынам ідзе непасрэдна на станцыю, — расказаў **Сяргей КАХАЕЎ, начальнік цэха забяспечвальных сістэм.**

Пакуль усё гэта ў тэорыі, на станцыі вядуцца пуска-наладачныя работы. Дарэчы, пад падлогай машыннай залы насоснай станцыі першага пад'ёму, дзе адбываецца тэрмічная ачыстка вады, якую падымаюць з ракі, — 22 метры глыбіні, што ўражвае.

— На думку вучоных, страты вады будуць на ўзроўні 2,2 працэнта, а ў самы спякотлівы і маловодны год — не больш за 6 працэнтаў. Так што адмоўнага ўздзеяння на раку не здарыцца, — запэўніў **Ігар КІРЭЕЎ, начальнік аддзела аховы навакольнага асяроддзя АЭС.**

Каб убачыць увесь ланцужок шляху вады, наведалі і станцыю другога пад'ёму. Тут тую частку вады, якая пасля ачышчэння вяртаецца з атамнай станцыі ў раку і мае тэмпературу, большую за прыродную, даахалоджваюць у пырскальным басейне. Гэта падземная канструкцыя даўжынёй 170, шырынёй 31 і глыбінёй тры метры. Цёплая вада распырскваецца ў фантанах і аддае цяпло ў атмасферу. Калі тэмпература становіцца меншай, чым сярэдняя па Віліі, вада самацёкам адпраўляецца ў раку, растлумачылі спецыялісты. Дарэчы, вада, якая цыркулюе ў ядзерным рэактары, у раку не трапляе.

Наступны аб'ект воднага падарожжа — будынак водападрыхтоўкі № 1. Тут у хімічным цэху ваду рыхтуюць для падачы на энергаблок.

— Неабходнасць падачы хімічна абяссоленай вады абумоўлена бяспекай. Хімічна ачышчаная, яна мінімізуе адкладанні, якія могуць з'явіцца на сценках абсталявання і трубаправодаў энергаблокаў, — расказаў **Яўген ЛЕСНІЧЭНКА, намеснік начальніка хімічнага цэха.**

А Міхаіл Міхадзюк заўважыў:

— Наша задача — знайсці разумны баланс у тарыфах, які б забяспечыў і развіццё галіны, і канкурэнтаздольнасць эканомікі. Каб узровень тарыфаў адпавядаў плацежаздольнасці насельніцтва.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**


«Сэрца» АЭС — цэнтральны шчыт кіравання.


**ОАО «КОНДИТЕРСКАЯ ФАБРИКА «СЛОДЫЧ»**
**осуществляет реализацию следующей техники:**

**✓ ТРАКТОР МТЗ 82.1,**
1992 года выпуска, по цене 9 600,00 руб. без учета НДС.

**✓ АВТОМОБИЛЬ MAZDA 6,**
2004 года выпуска, по цене 6 760,00 руб. без учета НДС.

**Телефоны для справок:**
**8 (017) 398 97 37; + 375 29 355 20 67; + 375 29 121 0 441.**

**Место расположения объектов:**
**г. Минск, ул. Радиальная, 54/2.** УНП 100129695

Антикризисный управляющий ЗАО «РосЕвроГупп» – ИП Залуцкая Анна Леонидовна (организатор торгов) извещает о проведении 10.05.2019 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 93А, оф. 404, открытых торгов по продаже дебиторской задолженности ЗАО «РосЕвроГрупп»: ООО «Древконтракт» (размер задолженности – 5840,67 BYN) – первоначальная цена 5840,67 BYN; ООО «МАГНУС групп» (размер задолженности – 969971,61 BYN ) – первоначальная цена 969971,61 BYN; ООО «МегаСервисГидро-ойл» (размер задолженности – 1602,50 BYN) – первоначальная цена 1602,50 BYN; СМП-667 ОАО «Трест Белтрансстрой» (размер задолженности – 200,70 BYN) – первоначальная цена 200,70 BYN; ООО «ЭльвираПроектИнвест» (размер задолженности – 2272,95 BYN) – первоначальная цена 2272,95 BYN; ООО «Эль-Град» (размер задолженности – 3200,00 BYN) – первоначальная цена 3200,00 BYN.

Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 86, с даты настоящей публикации по 04.05.2019 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации до 04.05.2019 г. вкл. на р/с ЗАО «РосЕвроГрупп» р/с BY02 ALFA30122602100060270000 в белорусских рублях ЗАО «Альфа-Банк», код ALFABY2X, УНП 191586390.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 5 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Уведомление участников об итогах торгов в день торгов, публично. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее чем за один день до их проведения.

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

**О выплате дивидендов акционерам ОАО «БНБ-Банк»**

В ходе проведения годового Общего собрания акционеров ОАО «БНБ-Банк», состоявшегося 29 марта 2019 года, было принято решение распределить между акционерами в виде дивидендов часть нераспределенной прибыли банка за 2018 год 1 107 515,84 (один миллион сто семь тысяч пятьсот пятнадцать рублей 84 копейки) белорусских рублей и объявить дивиденды в размере 0,00040 (сорок стотысячных) белорусского рубля на одну акцию.

Согласно решению указанного Общего собрания акционеров ОАО «БНБ-Банк» предусмотрен следующий порядок и процедура выплаты дивидендов:

- дата начала выплаты дивидендов – 9 апреля 2019 года;
- акционерам, являющимся нерезидентами Республики Беларусь, причитающиеся им дивиденды выплатить в долларах США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату принятия настоящего решения;
- акционерам, являющимся резидентами Республики Беларусь, причитающиеся им дивиденды выплатить в белорусских рублях;
- акционерам – физическим лицам выплату дивидендов осуществлять через кассу БНБ-Банка при их личном обращении;
- акционерам – юридическим лицам, индивидуальным предпринимателям выплату дивидендов осуществлять в безналичном порядке, путем перечисления денежных средств на текущие (расчетные) счета на основании их соответствующих письменных обращений;
- расходы по банковским переводам дивидендов осуществить за счет БНБ-Банка.

В случае если в результате расчета сумм дивидендов, причитающихся к выплате конкретному акционеру образуется остаток в виде дробной части копейки, такая дробная часть округляется в большую сторону, до одной копейки.

По возникающим вопросам вы можете проконсультироваться по телефонам Контакт-центра (17/33/29) 309 7 309 и 7 309 для абонентов velcom, Life:) и МТС, или направив свой вопрос по электронной почте customer@bnb.by.

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, №10 от 7 июня 2013 г.
УНП 100513485.

**Проведение первых торгов по продаже имущества ОДО «КАФЕ ЭКСПРЕСС»**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка 5 %, бел. руб. | Шаг торгов 5 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Пароковектомат Rational CPC | 7 745,67 | 387,28 | 387,28 |

Местонахождение лотов: г. Минск, ул. Антоновская, д. 2.

Торги в форме открытого аукциона будут проведены по адресу: г. Минск, ул. Антоновская, д. 2, каб. 18.

начало – 10 мая 2019 г. в 10.00.

Заявление на участие в торгах и необходимые в соответствии с законом документы, должны быть поданы с 09.00. 04.04.2019 по 18.00. 06.05.2019 по адресу организатора торгов.

Задаток на участие по лоту составляет 5 % от его начальной цены и должен быть перечислен по 06.05.2019 на расчетный счет продавца – ОДО «КАФЕ ЭКСПРЕСС», 220007, г. Минск, ул. Московская, д. 9, 1-й этаж IBAN: BY98BLBB30120100035591001001 в ОАО «Белинвестбанк», код BLBBBY2X, УНП 100035591, назначение платежа: задаток по лоту (наименование лота и его номер) для участия в торгах 10.05.2019. Организатор торгов: ООО «БизнесУэй», г. Минск, ул. Антоновская, д. 2, ком. 18, тел. +375 (29) 165-33-65. Продавец: ОДО «КАФЕ ЭКСПРЕСС». Ознакомиться с лотом можно в будние дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения лота, предварительно согласовав время прибытия. Цена без НДС. В случае признания торгов несостоявшимися по причине участия одного претендента лот может быть продан ему с его согласия по цене, увеличенной на 5 % от начальной цены. Победителем торгов (претендентом на покупку) возмещаются затраты на организацию и проведение торгов в размере 300 бел. руб. 64 коп. Срок подписания договора купли-продажи по 20.05.2019. Правила и порядок проведения торгов, оформление участия в открытых торгах указаны на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве www.bankrot.gov.by в разделе «Должник – ОДО «КАФЕ ЭКСПРЕСС» – имущество – реализация».

Сямейная газета

Выпуск № 6 (121)

## ВЕЦЕР ВАНДРАВАННЯЎ

Вясна — бацькі дашкольнікаў і малодшых школьнікаў не дадуць зманіць — гэта не толькі абуджэнне, першацветы і змена практычнага гардэробу на больш яркі і легкадумны. Гэта яшчэ неабходнасць хоць бы прыблізна паведаміць у школе ці дзіцячым садку, дзе вашы дзеці будуць аздараўляцца падчас ужо такіх блізкіх летніх вакацый, і самім спланаваць летні адпачынак. Не дзіва, што на розных рэсурсах пачкамі пачынаюць з'яўляцца парады і расповеды бывалых пра тое, як гэта лёгка, захапляльна і наогул беспраблемна — адпачываць з дзецьмі.

Энтузіясты-вандроўнікі ўпікаюць асцярожных бацькоў: маўляў, уся справа ў вашай уласнай ляноце і нежаданні адарваць пятую кропку ад роднай утульнай канапы. Насамрэч, сцвярджаюць такія нястомныя турысты, нават з немаўлятамі можна падарожнічаць хоць за тысячы кіламетраў і тры пералёты, павадзіць іх па музеях у Еўропе, паказаць світанак у Тайландзе, перазімаваць на Канарах і г. д.

Адкінем сілай волі нетактоўнае жаданне ўдакладніць, на якія такія залатыя запасы сярэднестатыстычнай сям'і з двума-трыма дзецьмі выправіцца на доўгія вакацыі, бо зразумела ж, атрымаем хрэстаматыйны адказ: хочаш добра адпачыць — трэба добра папацець, круціцца, шукаць варыянты. Сапраўды, фінансавы бок вельмі важны, але далёка не заўжды вызначальны ў планах падарожнікаў. Значна больш пытанняў узнікае да таго, ці ўсе ў сям'і маюць дастаткова моцны імунітэт, каб перанесці доўгую дарогу, змену часавага пояса, клімату, звыклай ежы і вады, ці ва ўсіх супадаюць інтарэсы ў плане культурна-асветніцкай праграмы ў адпачынку, або рашэнне прымаецца кімсьці адным, таму што «мне гэта цікава, значыць, усім будзе цікава»?

Не, я далёкая ад таго, каб абвінавачваць у крывадушнасці і эгаізме бацькоў, якія падарожнічаюць з дзецьмі. Але не трэба рабіць распаўсюджаную памылку і лічыць, што калі ў вас спрацавала пэўная схема, то ва ўсіх астатніх атрымаецца тое самае. Асабіста ведаю сям'ю, у якой бацькі перадалі сваё захапленне воднымі паходамі сыну, і сплаўляюцца яны разам з дзевяці месяцаў малога, і, тройчы цьфу-цьфу, з кожнага сплаву вяртаюцца па вушы задаволеныя, шчаслівыя і здаровыя. Але гэтаксама ведаю я і матулю, якая наслухалася парад знаёмых «не сядзець седзьма», пасадзіла малодшую дачку ў слінг, старэйшага сына на калені і паехала да мора — а вярнуўшыся вымушаная была лячыць жорсткую алергію ў малой і запаленне лёгкіх у сына... Дый сама яшчэ добра помню, як штораз падчас адпачынку маю дачку-дашкольніцу накрывала напоўніцу акліматызацыя, і прыкладна да яе пяці гадоў такія сямейныя канікулы прынасілі больш нервовых турбот, чым задавальнення. Нездарма ж большасць педыятраў не рэкамендуюць выязджаць у іншую кліматычную зону з зусім маленькімі дзецьмі (да таго ж з немаўлём да двух тыдняў вас не возьмуць на борт самалёта, да шасці месяцаў — на круізныя лайнеры) і абавязкова раяць, плануючы сямейны водпуск, укамплектаваць дарожную аптэчку з улікам стану здароўя вашага дзіцяці і пацікавіцца эпідэмічнай сітуацыяй у краіне, куды вы збіраецеся паехаць, асабліва калі дзіця не прышчэплена ад пэўных хвароб.

«З першым дзіцем я была ўпэўненая, што ведаю абсалютна ўсё, і імкнулася перадаць гэтыя сакральныя веды свету, — прызнаецца шматдзетная сяброўка. — З другім стала больш асцярожнай у выказваннях і ацэнках. А з трэцім наогул зразумела, што нічога як след не ведаю, што бацькоўству трэба яшчэ вучыцца і вучыцца. Таму, калі многія просяць падзяліцца, як мы ладзім сямейны адпачынак, — расказваю, але абавязкова падкрэсліваю, што гэта толькі наш канкрэтны досвед, і камусьці іншаму ён можа проста не падысці».

Словам, летні адпачынак — якраз той выпадак, калі варта сем разоў адмераць, суаднесці з аб'ектыўнай рэальнасцю ўсе вашы «хачу» і «магу». А потым ужо — надзімаць парусы і лавіць спадарожны вецер!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Тыя, хто побач

**Міхаіл ПАНДЖАВІДЗЭ:**

# «ДЗЕЦІ — РАДАСЦЬ І КАЛАСАЛЬНЫ СТЫМУЛ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ»




Фота Міхаіла НЕСЦЕРАВА.

**Моцныя творчыя сем'і, можна сказаць, нефармальны брэнд Нацыянальнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі. Тут шмат сямейных пар, і насуперак стэрэатыпам аб неверагоднай лёгкадумнасці артыстаў, многія з іх адзначылі ўжо сярэбраныя юбілеі сямейнага жыцця. Вось і галоўны рэжысёр Нацыянальнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Міхаіл ПАНДЖАВІДЗЭ і яго жонка — салістка оперы Кацярына ГАЛАЎЛЁВА ў красавіку адзначаць стальное вяселле.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Агульны клопат

# Я НЕ АДНА!

## На якую дапамогу можа разлічваць цяжарная жанчына

**Інтэрактыўная карта з бясплатнымі паслугамі для цяжарных жанчын, 500 захаваных жыццяў і інфармацыя медыкам для разваг наконт таго, што чакае ад іх жанчына, — такія вынікі праекта «Ты не адна». Ён рэалізоўваўся ў Мінску, Магілёве і Магілёўскай вобласці летась і ў пачатку гэтага года.**

— Крызіс можа прыйсці ў кожную сям'ю. Асабліва цяжка справіцца з ім цяжарнай жанчыне. Але якая б складаная ні была сітуацыя, шукаць дапамогу варта, — кажа **Ірына ШМАК, аўтар праекта, практычны псіхолаг, кіраўнік сацыяльнага цэнтра «Шчаслівы малы» SOS — дзіцячай вёскі Бараўляны.** — Кіруючы на працягу пяці гадоў цэнтрам, я зразумела, што існуе шмат грамадскіх арганізацый, клубаў узаемадапамогі, але яны дзейнічаюць адасоблена і іх складана шукаць, асабліва калі жанчына ў крызісе. Так узнікла ідэя кансалідаваць усе віды дапамогі цяжарным жанчынам і іх сем'ям.

Інтэрактыўная карта аб'ядноўвае тыя месцы, дзе жанчына можа атрымаць дапамогу медыка, сацыяльнага работніка, юрыста, псіхолага. Да рэалізацыі праекта далучыліся камітэт па ахове здароўя і камітэт па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінгарвыканкама, а таксама Магілёўскі аблвыканкам і Магілёўская цэнтральная паліклініка. Карта мае і чырвоную кнопку, якая азначае, што жанчыне неабходна дапамога тут і цяпер. Але карыстацца сэрвісам можна не толькі ў крытычнай сітуацыі. На карце пазначаны месцы, дзе цяжарная жанчына можа бясплатна патрапіць на фітнес, наведаць музей ці, скажам, паспяваць у хоры.



Ірына ІКАНАСТАСАВА.

У межах праекта прайшло шмат сустрэч, дзе спецыялісты дапамаглі будучым мамам, а таксама даведаліся, чаго пацыенткі чакаюць ад іх у першую чаргу.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

# Я НЕ АДНА!


Удзельнікі праекта падчас падвядзення вынікаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Летам мінулага года прайшла акцыя «Гарадскі радзільны дом, добразычлівы да сям'і», якую падтрымала кіраўніцтва Мінгарвыканкама, — расказала **галоўны акушэр-гінеколаг Мінска Ірына ІКАНАСТАСАВА.** — Усе сталічныя радзільныя дамы прынялі ў ёй удзел: у кожным прайшоў Дзень адкрытых дзвярэй для цяжарных жанчын і іх сем'яў. У ім узялі ўдзел 840 будучых мам. У кожным радзільным доме адбыўся адкрыты дыялог: акушэры-гінеколагі, неанатолагі, анестэзіёлагі, псіхолагі расказалі пра мацярынства і адказалі на пытанні будучых пацыентак. Для медыкаў гэта таксама было карысна. Я асабіста чула выказванні, як такія мерапрыемствы мяняюць свядомасць урача і паказваюць, над чым нам трэба працаваць.

Сёлета ў студзені падчас «Калядных сустрэч» урачы расказалі цяжарным пра заўчасныя роды, аказанне педыятрычнай дапамогі, у прыватнасці пра вакцынацыю нованароджаных і прымяненне антыбіётыкаў, пра рэзус-адмоўную і пупавінную кроў, ствалавыя клеткі, а пластычны хірург нават бясплатна дапамог адной з пацыентак у пасляродавым перыядзе. Гасцям прапанавалі паўдзельнічаць у даследаванні і запоўніць анкеты, каб высветліць, якія якасці ў медработніках яны больш за ўсё цэняць. На пытанні адказалі 1118 жанчын. Амаль 600 з іх найважнейшай якасцю ўрача назвалі камунікабельнасць. Наступнымі па важнасці якасцямі сталі кампетэнтнасць (264), а таксама ўважлівасць і ўменне суперажываць (203).

— Пазалетась у Мінску пачалі адкрывацца кабінеты псіхалагічнай дапамогі «За жыццё», куды звяртаюцца жанчыны, якія вырашылі перарваць цяжарнасць. Эфект перадабортнага кансультавання — 17 %, а гэта між іншым 500 захаваных цяжарнасцяў, — працягвае Ірына Іканастасава. — Такія кабінеты мы захаваем, але, магчыма, крыху зменім іх назву. Акрамя медыка і псіхолага, двойчы ў месяц з жанчынамі будзе сустракацца спецыяліст з раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання, які раскажа пра выплаты і дапамогі для цяжарных і жанчын з дзецьмі. Дарэчы, у апошнія 5—10 гадоў назіраецца добрая дынаміка скарачэння перарывання цяжарнасцяў.

— Як паказвае практыка, не заўсёды жанчыны ведаюць пра тую дапамогу, якую дзяржава аказвае сем'ям, пра меры сацыяльнай падтрымкі, — дадае **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына ДУДКА.** — Штогод Мінск прырастае на адну тысячу шматдзетных сем'яў, але ў той жа час нараджаць другое дзіця многія сем'і не жадаюць. Таму гэты праект для нас цікавы і важны. Дзякуючы яму мы даведваемся пра сем'і, у якіх выхоўваюцца хворыя дзеткі. У 80 % такіх выпадкаў мама застаецца адна, а бацька сыходзіць. Такія сем'і неабходна суправаджаць і псіхолагам, і сацыяльным работнікам.

Як адзначыла **галоўны спецыяліст аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя Юлія САВАЧКІНА,** здароўе маці і дзіцяці — прыярытэтная задача для дзяржавы.

— За кожнай цяжарнай жанчынай стаіць жыццё. І медыкам важна навучыцца кантактаваць з ёй не жорстка і казённай мовай, а так, каб жанчына адчувала сябе камфортна. Мы і далей будзем падтрымліваць такія праекты, якія пазітыўна ўплываюць на імідж урача.

У Мінску ўзрост, у якім жанчына нараджае першае дзіця, павялічваецца. Першы раз жанчыны нараджаюць у 27—29 гадоў, другі — пасля 30. Зрэшты, такая тэндэнцыя характэрная для многіх краін Еўропы і ЗША. Колькасць родаў у непаўналетніх у сталіцы невялікая — каля 15—20 у год. Парадзіх старэйшых за 45 гадоў таксама няшмат — каля паўсотні за год. Ва ўзросце 40—45 гадоў штогод нараджае каля 500 мінчанак.

**Алена КРАВЕЦ.**

Бяспека

# СУР'ЁЗНЫЯ ГУЛЬНІ

## Каб з дзяцінства ведаць, як паводзіць сябе ў надзвычайных сітуацыях

**Паспрабаваць патушыць агонь, зрабіць штучнае дыханне, прайсці праз задымлены пакой, выратаваць чалавека, які трапіў у палонку, пагутарыць з дыспетчарам службы 101... У Гомельскім цэнтры бяспекі жыццядзейнасці і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС дзецям разам з бацькамі прапануюць прайсці праз складаныя квэсты. Дарэчы, самі сітуацыі ратавальнікі не з галавы ўзялі.**


Дзеці вучацца выклікаць службу выратавання.

Відавочны прыклад: расчыняецца ліфт, і ў яго праёме — нейкі брудны чалавек. Амаль усе з тых, у каго пыталіся пра далейшыя дзеянні, адмаўляюцца ехаць з непрыемным персанажам.

— А калі ў тым жа ліфце адбудзецца сустрэча з незнаёмцам, які шчыра ўсміхаецца — паедзеце ці не? — распытвае школьнікаў **начальнік цэнтра бяспекі Дзяніс КРУК.**

Усе хорам кажуць, што ў гэтым выпадку яны спакойна паедуць разам з мужчынам. Між тым вядома, што маньякі і гвалтаўнікі часцей за ўсё не выклікаюць падазрэнняў і выглядаюць прыстойна. Дарэчы, спецыялісты цэнтра не проста тлумачаць розныя сітуацыі на прыкладах. Яны даюць магчымасць самому паспрабаваць, напрыклад, выратаваць чалавека з палонкі. І вось ужо пяцікласнік Арцём Бурлевіч з Глушкавічаў Лельчыцкага раёна паўзе па імправізаваным лёдзе і працягвае клюшку манекену, які гучна просіць ратунку і здольны «рукамі» ўхапіцца за прыладу для выратавання.

Простыя з першага погляду тэсты на камп'ютарах часта выдатна праходзяць дзеці, а дарослыя пачынаюць сумнявацца ў адказах. Пры гэтым супрацоўнікі МНС добра ведаюць, што малыя могуць губляцца ў сітуацыі, калі небяспека ўзнікае ў рэальным жыцці. Менавіта таму ў асобным пакоі ўстаноўлены тэлефоны, каб навучыцца выклікаць службу выратавання. Высвятляецца, што многія школьнікі нават у імітаваных абставінах не ведаюць, як адказваць на пытанні дыспетчара пра ўмоўнае здарэнне. Ім мякка падказваюць спецыялісты цэнтра і паступова падштурхоўваюць да самастойнай размовы. У некаторых атрымліваецца, а іншыя дзеці нават слова не могуць вымавіць. Тое ж адбываецца, калі школьнікам прапануюць прайсці праз цёмную задымленую «кватэру».

— Навучыць можна толькі на практыцы, — упэўнены Дзяніс Крук. — Мы тут пачынаем заняткі непасрэдна з калідора ўстановы. У нас ён — калідор небяспек. Бачыце — вакол выявы ўсіх прыродных небяспек, якія сустракаюцца на тэрыторыі Беларусі. Вось багна, напрыклад, вось вадаёмы і рэкі, вось пяшчаныя кар'еры...

На кожны ўзрост — свая падача вучэбнага матэрыялу. Але ж здаецца, дзеці яго тут успрымаюць не як сумную навуку. Наадварот, з цікавасцю і задавальненнем бяруць у рукі сапраўдны вогнетушыцель, які «гасіць» умоўнае полымя на экране.

— Важна, каб дзеці зразумелі, што ў выпадку складанай сітуацыі дарагая кожная секунда, — падкрэслівае Дзяніс Уладзіміравіч. — Каб бралі ў рукі тэлефон не з мэтай, каб зняць відовішча і выкласці потым у сацыяльную сетку, а каб паведаміць хутчэй у адпаведныя службы. Трэба навучыць дзяцей саміх аказваць першую дапамогу.

Навучальны пакой ёсць і для маладых бацькоў, якія часта небяспеку пачынаюць успрымаць толькі тады, калі сутыкаюцца непасрэдна з яе сумнымі наступствамі. «Кватэру», дзе можна заўважыць небяспечныя моманты штодзённага жыцця, адкрылі зусім нядаўна. На гэтай пляцоўцы паказваюць, як пазбегнуць сітуацый, якія прыводзяць да траўмаў і трагедый.

Самае простае і відавочнае — кубачак з гарачым напоем, пакінуты на краі стала. Менавіта ён часцей за ўсё становіцца прычынай апёкаў, з якімі дзяцей прывозяць у стацыянар. Мэбля, электрапрыборы, лекі і батарэйкі — вось тое, што ў кватэры трэба схаваць далей ці замацаваць. У гэтым пакоі знаходзяцца яшчэ і сучасныя трэнажоры, вельмі падобныя... на сапраўдных немаўлят. На іх супрацоўнікі МНС навучаюць аказанню першай дапамогі ў выпадках, калі малое ўзяло ў рот нейкі іншародны прадмет.


Арцём БУРЛЕВІЧ ратуе «пацярпелага».

Цэнтр бяспекі спецыялізаванага ліцэя пры Універсітэце грамадзянскай абароны МНС Рэспублікі Беларусь у год наведваюць 12—13 тысяч чалавек. Ён знаходзіцца хоць і блізка, але за Гомелем. А вось іміджавы пакой з падобнай інфармацыяй — у самым цэнтры горада, у Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы.

Правілам паводзін у надзвычайных сітуацыях вучаць спецыялісты МНС. Асновы бяспекі дома, на вуліцы, пры пажары, на рацэ даступна тлумачаць праз гульню, мультфільмы і ілюстрацыі. Гуляць і вучыцца тут можна штодзень пад наглядам выхавальнікаў. Кожны тыдзень асобныя заняткі з дзецьмі праводзяць прафесіяналы — супрацоўнікі Гомельскага гарадскога падраздзялення МНС. Яны сваімі рукамі аформілі сцены гульнявога пакоя ў стылі мультфільма «Кот Леапольд». Героі, намаляваныя на сценах, нагадваюць аб правілах бяспекі, звяртаюць увагу на нумары тэлефонаў экстранных службаў. Цацачная пажарная тэхніка, разнастайныя па форме і змесце тэматычныя гульні ўводзяць дзіця ў курс рэальных жыццёвых сітуацый. Усё разам дапамагае зрабіць працэс навучання займальным і запамінальным.

Да канца года падобныя іміджавыя пакоі для дзяцей з'явяцца ў кожным раённым цэнтры Гомельскай вобласці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ, фота аўтара.**

Асабістае меркаванне

# КАЛІ ДЗІЦЯ СПРАБУЕ ЦЯБЕ «НА ЗУБ»...

## Прыёмнае бацькоўства без прафесійнай адукацыі — шлях да вяртання малога ў дзетдом



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Жаданне ўзаемадзейнічаць, самаўдасканальвацца і працаваць мамай і татам, а не проста імкненне дапамагчы дзіцяці і самому адчуць пяшчоту, павінна кіраваць людзьмі, якія збіраюцца стаць прыёмнымі бацькамі. На адных эмоцыях ад першага знаёмства, без самааддачы і разумення, на што падпісаўся, калі вырашыў стаць прыёмным бацькам, новая сям'я доўга не праіснуе. Чаму дзіця ніколі не вінавата, як не дайсці да разусынаўлення праз непаразуменне і навошта апекунам і ўсынавіцелям прафесійная падрыхтоўка, расказвае Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, загадчык сектара сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама.**

### Недахоп увагі ці клапатлівы кантроль?

Часта людзі, якія збіраюцца стаць апекунамі ці прыёмнымі бацькамі, думаюць: свайго выгадаваў, выгадую і чужога. А пасля разумеюць, што атрымліваецца не так, як бачылася, а афармленне папер на дзіця — не самая вялікая праблема, як здавалася напачатку, гаворыць спецыяліст.

Першае знаёмства папячыцеляў і малога заўжды прыемнае, прыхільнасць адзін да аднаго з'яўляецца вельмі хутка. Дзіця заўжды задаволена сваім новым становішчам. Напачатку яно выконвае ўсё, што папросяць, можа зваць апекуноў мамай і татам. Аднак усё гэта не азначае, што дзіця адразу палюбіла новых бацькоў. З часам малое прыстасоўваецца да новых умоў, навізна знікае, і паводзіны малечы мяняюцца: яно адмаўляецца падпарадкоўвацца, спрабуе бацькоў «на зуб», высвятляе межы дазволенага. З'яўляюцца дэпрэсія, сваркі, агрэсія, слёзы, уцёкі...

— Прыходзячы ў сям'ю, дзіця думае: я цяпер тут галоўны, у мяне будзе суцэльнае свята — гульні, клопат, увага. Аднак бацькі часта рашаюць жыццёвыя праблемы, а малому раяць заняцца чымсьці самастойна. Супрацьлеглы бок стаўлення да малога — татальны кантроль як праяўленне празмернага клопату. Мне кожны раз балюча, калі я накіроўваю малых з апякунскай і тым больш прыёмнай сям'і назад у дзіцячы дом. Пасля высвятляецца, што бацькі хацелі прымусіць выхаванца падпарадкоўвацца сваім загадам і прытрымлівацца ўласных традыцый. У нас прыёмнымі бацькамі могуць стаць усе ахвотныя, хто не пераходзіў мяжу закону. Аднак яны не разумеюць шмат псіхалагічных тонкасцяў, — падзялілася Зінаіда Вараб'ёва. — Мы ўжо наладзілі ў горадзе сістэму дапамогі бацькам, аднак усё роўна знаходзімся яшчэ на пачатку шляху. Каб дзіця паспяхова сацыялізавалася і зносіны паміж новымі членамі сям'і усталёўваліся нармальныя, патрэбны час. І намаганні павінны прыкладаць менавіта дарослыя. Дзіця ніколі не вінаватае, якім бы непаслухмяным ці кепскім яго ні стараліся выставіць. Калі так кажуць, я ўжо бачу, што сям'я задумваецца: «Навошта мы яго бралі?»

### Умацаваць нельга зруйнаваць

Работа ў нас наладжана так, што, калі дзіця страціла ўласную сям'ю, у яго павінна з'явіцца замяшчальная. Прычым усынаўленне зусім не абавязковае. Але найлепшая форма выхавання для малога тая, што адпавядае менавіта яго інтарэсам, лічыць прадстаўніца камітэта па адукацыі:

— Калі ў дзіцяці цудоўныя сваякі, навошта яго аддаваць на ўсынаўленне? Няхай лепш родныя стануць яго апекунамі. А многія і самі нізавошта не аддадуць сваіх пляменнікаў ці ўнукаў чужым. А ёсць яшчэ ўзроставыя дзеці, якім гадоў 15—16, і яны лепш пойдуць у дзіцячы дом, а па выхадных да бабулі будуць прыязджаць, а не ў прыёмную сям'ю. І да жаданняў дзяцей мы прыслухоўваемся заўжды, а з дзесяці гадоў — абавязкова.

Усынаўленне, дарэчы, таксама не пажыццёвы статус. Яго можна адмяніць, і, як правіла, робяць гэта дарослыя, якія не справіліся. Аднак быў выпадак, што ўсыноўленыя дзеці пасля свайго 14-годдзя падалі ў суд на ўсынавіцеляў, якія выпівалі. Падлеткі дамагліся разусынаўлення згодна з 139-м артыкулам Кодэкса аб шлюбе і сям'і.

Дзіця можа як умацаваць сям'ю, так і зруйнаваць яе. Нельга чакаць, напрыклад, што новы чалавек запоўніць месца ад страчанага сям'ёй папярэдняга дзіцяці. Гэта амаль 100-працэнтны провал. Таму так важна, што ў кожным раёне Мінска штомесяц працуюць групы па падрыхтоўцы ўсынавіцеляў. Дарэчы, не ўсе даходзяць да стадыі ўсынаўлення, атрымаўшы веды на гэтых курсах.

Ва ўсіх выпадках вельмі важна, каб прыёмныя бацькі ўмелі ўзаемадзейнічаць са сваякамі дзіцяці і не забаранялі стасункі паміж імі. А таксама сур'ёзна ставіліся да сацыяльных педагогаў і псіхолагаў у школах. Усе праблемы можна пераадолець, было б жаданне, упэўнена Зінаіда Вараб'ёва.

### Адказнасць за гульні і гутаркі

Незалежна ад таго, трапляе дзіця ў прафесійную сям'ю — дзіцячы дом сямейнага тыпу ці да прыёмных бацькоў, або ідзе пад апеку, папячыцельства, на ўсынаўленне, усе гэтыя формы выхавання сутыкаюцца з цяжкасцямі падчас наладжвання стасункаў з малымі.

**Часта людзі, якія збіраюцца стаць апекунамі ці прыёмнымі бацькамі, думаюць: свайго выгадаваў, выгадую і чужога. А пасля разумеюць, што атрымліваецца не так, як бачылася.**

Дарослыя павінны шмат часу аддаваць дзецям і прымаць на сябе адказнасць за сумесныя з імі гульні, гутаркі, заняткі, за ўласныя паводзіны, якія будзе капіраваць малы.

— Гэта павольнае пранікненне ў інтарэсы дзіцяці і пастаянная дапамога яму. Каб падтрымаць малога, трэба ведаць, што з ім адбываецца, разумець яго думкі і памкненні. Гэта трэба ўмець рабіць, нават нягледзячы на страту ўласнага часу, і да такой працы неабходна быць гатовым, — пераканана прадстаўніца Мінгарвыканкама.

Аднак нават з улікам усіх намаганняў няма гарантыі, што з часам паміж дзіцем і бацькамі з'явіцца эмацыянальная сувязь. Дарослыя павінны справіцца з гэтымі цяжкасцямі, а задача спецыялістаў — навучыць іх спраўляцца.

— Быць замяшчальнымі бацькамі і пераадольваць праблемы павінны вучыць спецыялісты сацыяльна-педагагічных цэнтраў (СПЦ). І тады, калі дзяцей толькі аддаюць, і падчас суправаджэння сям'і. У раённых СПЦ сталіцы, згодна з новым палажэннем, ёсць цяпер аддзелы па суправаджэнні замяшчальных сем'яў. Падобныя ж службы існуюць у школах. У педагагічным ВНУ таксама больш увагі сталі аддаваць падрыхтоўцы спецыялістаў, у тым ліку па пытаннях замяшчальнага бацькоўства. Так што да нас прыходзяць больш падрыхтаваныя спецыялісты. Аднак самае галоўнае для поспеху — гатоўнасць бацькоў да самаадукацыі, — упэўнена Зінаіда Вараб'ёва. — У саміх замяшчальных бацькоў павінна быць культура на прыняцце гэтай падтрымкі. Мы праводзім трэнінгі, ладзім семінары, арганізуем клубы прыёмных бацькоў. Аднак калі чалавек проста прыйдзе пасядзець, а не паўдзельнічаць, то няма гарантыі, што ён справіцца з праблемай.

У Цэнтральным раёне Мінска, напрыклад, паспяхова працуюць супервізары, якія праводзяць работу з групай людзей, што займаюцца адным відам дзейнасці. На такіх сустрэчах здымаюцца многія пытанні. А яшчэ, магчыма, сёлета ўнясуць змяненні ў палажэнні аб патранатным выхаванні, прыёмнай сям'і і дзіцячым доме сямейнага тыпу. Работа яшчэ больш палепшыцца са з'яўленнем агульнагарадскога СПЦ, які аб'яднае сталічную сістэму па абароне правоў дзяцей.

— Неабходнасць гэтага даўно наспела, — лічыць спецыяліст. — А статус бацькоў-выхавальнікаў у грамадстве павінен стаць больш высокім, бо яны працуюць з дзецьмі кругласутачна. Тым не менш Мінск мае патрэбу ў прыёмных бацьках і бацьках-выхавальніках. Апошнім, дарэчы, выдзяляецца ўсё неабходнае для выхавання, у тым ліку і 7-8-пакаёвыя кватэры.

**Ірына СІДАРОК.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА**

***ОРГАНИЗАТОР**: ЛУКОМЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЧАШНИКСКОГО РАЙОНА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ*

| № лота | Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Целевое назначение | Условия и ограничения | Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб. | Начальная цена, руб. | Сумма задатка 10 %, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Витебская обл., Чашникский р-н, Лукомльский с/с, д. Абузерье, ул. Дачная, 1У, площадью 0,2494, 225183000101000074 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | В водоохранной зоне водного объекта реки, водоема (озеро Лукомльское), код – 2,4, площадь – 0,2494 га; земельные участки, расположенные в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильной дороги, код – 7,1, площадь – 0,2494 | 1567,79 + расходы, связанные с опубликованием объявления | 4000,00 | 400 ,00 |

Условия проведения аукциона:

наличие не менее двух участников;

заключение с Лукомльским сельским исполнительным комитетом соглашения.

Победителю аукциона либо в случае признания аукциона несостоявшимся единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившего согласие на предоставление ему земельного участка в частную собственность:

– возместить затраты, связанные с проведением аукциона;

– внести плату за земельный участок;

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории:

подключение к сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД.

Аукцион состоится **10 мая 2019 года в 15.00** по адресу: аг. Лукомль, ул. Максима Горького, 9, Лукомльский сельисполком.

Заявления и пакет необходимых документов предоставляются участниками с 8.00 до 17.00 по **4 мая 2019 года** включительно по адресу: аг. Лукомль, ул. Максима Горького, 9.

1. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, подавшие в установленном порядке заявление на участие в аукционе, а также документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка, кроме того, в комиссию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования, а представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет р/с BY68AKBB36413290522002200000 в ЦБУ № 222 филиала № 215 ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Орша, БИК AKBBBY21215, УНП 300986851, код платежа – 4901, получатель – Лукомльский сельский исполнительный комитет.

Оплата стоимости предмета аукциона, подлежащая возмещению Победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона.

Контактные телефоны: 8 (02133) 6 41 45, 6 94 35.

**Ликвидационная комиссия РУПП «Гроднотекстиль» объявляет о проведении повторного аукциона по продаже имущества: трубы стальные от тепловой сети**

| Наименование | Кол-во (метр) | Цена аукциона с НДС | Сумма задатка (10 %) |
|---|---|---|---|
| Труба стальная б/у диаметром 108 мм, толщиной стенки 4 мм | 374,05 | 1377,55 | 137,76 |
| Труба стальная б/у диаметром 325 мм, толщиной стенки 8 мм | 695,8 | 15 622,94 | 1562,29 |
| Труба стальная б/у диаметром 219 мм, толщиной стенки 6 мм | 875,6 | 9910,39 | 991,04 |
| Труба стальная б/у диаметром 57 мм, толщиной стенки 3,5 мм | 103,7 | 172,47 | 17,25 |
| Итого | 2049,15 | 27 083,35 | 2708,34 |

Имущество находится по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121. Торги состоятся 19 апреля 2019 года в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Горького, 121. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

– копия платежного поручения о внесении на счет РУПП «Гроднотекстиль»№ BY32BLBB30120500048503001001 БИК BLBBBY2X в ОАО «Белинвестбанк» г. Гродно, УНП 500048503, суммы задатка;

– копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица (индивидуального предпринимателя).

Документы должны быть представлены до 15.00 16 апреля 2019 года.

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат продавца по оценке и объявлению в газете. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Также покупатель производит демонтаж трубопровода, эстакад, надземных опор, уборку теплоизоляционного слоя с территории продавца.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Телефон для справок 43-99-64. УНП 500048503

# Павел Сухі і Соф'я Цянчынская:

## АД НАСТАЎНІЦТВА Ў ПРАВІНЦЫІ ДА СУСВЕТНАЙ СЛАВЫ

**Гаворачы пра «сямейства Сухіх», людзі ў першую чаргу ўяўляюць самалёты: сканструяваны па заданні Сталіна СЗ-1, легендарны знішчальнік СУ-17, франтавы бамбардзіроўшчык СУ-24М, пасажырскі Sukhoi Superjet 100 і дзясяткі іншых «стальных птушак». Нікому і думка ў галаву не прыходзіць пра «зямных» блізкіх геніяльнага авіяканструктара — жонку, дзяцей, унучак. А, між іншым, іх Павел Восіпавіч любіў не менш, чым работу.**



Валерый ДРЫГА з партфелем Паўла Восіпавіча і клатчам Соф'і Феліксаўны.

### Ён азірнуўся паглядзець

«Неяк увечары я вярталася са школы. Мяне апярэдзіў незнаёмы чалавек у ваенным шынялі, перафарбаваным у чорны колер, на галаве яго красавалася маленькая шапачка — «керанка». Я тады звярнула ўвагу на вялікія вочы незнаёмца і смешную «кавалерыйскую» хаду. Праз два дні гэты чалавек з'явіўся ў нашай школе і стаў выкладаць матэматыку. Я давала ў школе ўрокі французскай...» — так Соф'я Цянчынская ўспамінала сваю першую сустрэчу з Паўлам Сухім у палескім гарадку Лунінец. Абодвух лёс закінуў сюды выпадкова і зусім нядоўга. Ужо праз год пасля знаёмства Сухі і Цянчынская вымушаны былі пакінуць Палессе і падацца на ўсход краіны: Лунінец уваходзіць у склад Польшчы. Вядома, што некаторы час Павел працаваў у чыгуначнай школе разам з бацькам, а пасля вярнуўся ў Маскву — працягваць вучобу ў аднаўленым вышэйшым тэхнічным вучылішчы. Прыкладна тады ж у сталіцу адправілася і Соф'я — яе сястра рана аўдавела і засталася адна з маленькімі дзецьмі. Валоданне французскай мовай дапамагло маладой настаўніцы знайсці работу. Яна ўладкавалася ў Інстытут фізкультуры.

Другі раз лёс звёў іх на вуліцы, толькі не на ціхай палескай, а на гулкай маскоўскай. З таго моманту вырашылі не расставацца. У 1923-м пабраліся шлюбам і першым часам жылі ў маленькім пакойчыку Соф'і Феліксаўны. Жонка з самых першых дзён падтрымлівала мужа ў пачынаннях, перакладала замежную тэхнічную літаратуру для яго. Павел Восіпавіч быў апантаны сваёй справай: вучыўся, займаўся ў гуртку, падпрацоўваў у канструктарскім бюро Фаміна. Пры гэтым сям'я ў яго ніколі не была на другім месцы.

— Дзяцей — дачку Ірыну і сына Дзмітрыя, пляменнікаў — вельмі любіў. Шумныя вечарынкі ніколі яго не цікавілі. У даваенны час адпачываць Сухія ездзілі да сваякоў на Гомельшчыну.

Вузкае сямейнае кола было найлепшай кампаніяй для Паўла і Соф'і, — расказвае **Валерый ДРЫГА, педагог-арганізатар і куратар музейна-выставачнай дзейнасці Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога.**

На стале ляжыць стос чорна-белых фотаздымкаў. На адным з іх знакаміты авіяканструктар зусім не такі, якім мы прызвычаіліся яго бачыць: замест касцюма і капелюша свабодная белая кашуля, твар крануга ўсмешка, поруч жонка з букетам рамонкаў. Ці вось яшчэ: ён ужо ва ўзросце — сярод зімовага лесу разам з унучкамі.




Дарагія сэрцу рэчы: туфлікі ўнучак і духі жонкі авіяканструктара.

— «Асабістых» успамінаў пра Сухога засталося не так шмат. Біёграфы ў сваіх кнігах звесткі пра сям'ю даюць ускосна, больш пра самалёты пішуць, пра дасягненні. А людзей, якія ведалі авіяканструктара ў яго «беларускі» перыяд жыцця, увогуле не засталося. Таму аднаўляць хроніку тых дзён даводзіцца па крупінках. Мне пашчасціла пазнаёміцца з унучкай Паўла Восіпавіча Марыяй Георгіеўнай. Разам спрабуем раскрыць таямніцы жыцця яе знакамітага дзядулі — яна ў Маскве, я ў Беларусі, — дзеліцца Валерый Аляксеевіч.

Вынік сумеснай работы — вялізны архіў з фота, кнігамі, лістамі. Тут жа, ва ўніверсітэцкім музеі, захоўваюцца дзясяткі асабістых прадметаў — ад дарэвалюцыйнага дапаможніка па арыфметыцы гімназіста Паўла да любімых туфель на абцасах яго жонкі Соф'і.

### Прызнанне з водарам Chanel

Як так сталася, што самая поўная экспазіцыя, прысвечаная жыццю сям'і Сухіх, аказалася ва ўніверсітэцкім музеі? Апантаны збіральнік і захавальнік музея спадар Дрыга толькі загадкава ўсміхаецца ў адказ.

— З Гомелем Сухога звязвала многае. Тут ён рос і фарміраваў свае погляды на жыццё, упершыню ўбачыў самалёты і «захварэў небам», некаторы час працаваў, а пасля прыязджаў адпачываць ад мітуслівай Масквы. Самае цікавае, што будынак гімназіі, дзе вучыўся Павел Восіпавіч, зараз займае... Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту. Чаму ж яму не прысвоілі імя знакамітага земляка? Па-першае, гэта ўніверсітэт наземнага транспарту, а дзе Сухі — там самалёты. Па-другое, менавіта ў нашай навучальнай установы даўно склаліся сяброўскія і пладавітыя адносіны з канструктарскім бюро Сухога ў Маскве. Быў час, калі нашых выпускнікоў туды нават на адпрацоўку забіралі, а таленавітым студэнтам плацілі імянныя стыпендыі. Па-трэцяе, дом, у якім жыла сям'я Сухіх, знаходзіцца на Клубным (былым Царкоўным) завулку каля царквы Святога Мікалая і Палескага чыгуначнага вакзала. Зараз гэта Савецкі раён Гомеля і тэхнічны ўніверсітэт імя Сухога знаходзіцца таксама на яго тэрыторыі.

Нягледзячы на тое, што бацькі выйшлі з сялян, Сухі з самага дзяцінства быў надзвычай выхаваны і тактоўны. Меў добрыя манеры і густ. Яшчэ падчас вучобы ў Аляксандраўскай гімназіі Гомеля маленькі Павел у ліку найлепшых вучняў пабываў у Зімнім палацы на сустрэчы з імператарам Мікалаем II. А класе ў дзявятым «за добрую вучобу» разам з гімназістамі адправіўся ў вандроўку ў далёкі Туркестан, якую ініцыявала і аплаціла Ірына Паскевіч.

— У сям'і было шасцёра дзяцей: пяць дачок і сын. Паколькі бацька Восіп выкладаў у школе чыгуначнікаў не толькі асноўныя прадметы, але і спевы,раслі ў атмасферы творчасці. Дома выпускаўся сямейны часопіс і ладзіліся «канцэрты». Павел меў добры слых і прыемны голас. Аднак пасля паездкі на Усход пра спевы прыйшлося забыць: там хлопчык перанёс дызентэрыю, якая моцна падарвала здароўе будучага авіяканструктара. Праз некалькі гадоў пасля гэтага Павел Восіпавіч захварэў на шкарлятыну. «Цудоўны голас» знікне, а замест яго з'явіцца надзвычайная дакладнасць і сціпласць у кожнай фразе, — расказвае спадар Дрыга. — Калі ў сваім кабінеце падчас размовы ён падыходзіў да акна і пачынаў глядзець удалечыню, гэта азначала адно — суразмоўніку пара на выхад.

Калегі і знаёмыя, успамінаючы пра Паўла Восіпавіча, адзначаюць яго знешні спакой, нешматслоўнасць. Быццам прозвішча наклала адбітак на яго характар і зрабіла ў некаторым сэнсе «сухаватым» на праяву эмоцый.

«Будучы вельмі замкнутым на рабоце, П. О. (*так яго называлі ў канструктарскім бюро за вочы.* — **Аўт.**) «раскрываўся» толькі дома, у сям'і. Сям'я была для яго аддушынай», — успамінае Алег Самайловіч, якому давялося працаваць побач з Сухім у 1957—1975 гадах.

Сярод музейных экспанатаў знаходзім скураны партфель Паўла Восіпавіча.

— Ён ніколі не выкарыстоўваўся па прызначэнні, аднак мае цікавую гісторыю. Напрыканцы 50-х на лесвіцы канструктарскага бюро Сухі зрабіў камплімент Алегу Самайловічу: «Цудоўны партфель». Лаканічная фраза ад начальніка запала ў галаву маладому інжынеру. Увечары Алег пабег у ГУМ, набыў такі ж партфель і на наступны дзень прынёс начальніку прэзент. Павел Восіпавіч, які прынцыпова ніколі не прымаў падарункаў ад падначаленых, пашкадаваў земляка (Самайловіч таксама быў беларусам) і купіў у яго партфель. Хоць усё жыццё на работу і з работы ішоў з пустымі рукамі. Не насіў ні папак, ні тым больш партфеляў: усе распрацоўкі былі сакрэтныя, — расказвае Валерый Дрыга. — Унучка Марыя прыгадвала, што дзед дома аб рабочых справах не гаварыў. Увечары, пакуль гатавалася вячэра, ён чытаў прэсу. Сям'я выпісвала шмат газет, часопісы «Огонёк», «Знание — сила». А партфель доўгі час знаходзіўся на лецішчы, там яго і знайшлі.

Затое ёсць у музеі і рэчы, за якія Сухі браўся кожны дзень, — яго лінейкі, акуляры, будзільнікі. Захоўваецца тут і яго знакаміты капялюш. Побач з лаканічнымі мужчынскімі рэчамі ляжаць дамскія штучкі — клатч Соф'і Феліксаўны і веер да вячэрніх выхадаў. Захаваліся нават туфлікі ўнучак, якія памяшчаюцца на далоні.

— У 1961-м Сухі адправіўся на знакаміты авіясалон Ле-Буржэ ў Францыю прадстаўляць новую тэхніку. Там захапленне талентам Паўла Восіпавіча выказала сама Како Шанэль і ў якасці сувеніра перадала Соф'і Феліксаўне духі «Chanel № 5», — загадчык музея дастае маленькі флакончык, пра які савецкія жанчыны маглі толькі марыць, а следам за ім выцягвае з шафы засохлы «букет» тытуню. — Ён заўсёды ляжаў у шафах Паўла Восіпавіча. Звычку ён пераняў ад бацькоў і рабіў так, каб моль не заводзілася.



Павел Восіпавіч і Соф'я Феліксаўна ў Маскве, канец 50-х — пачатак 60-х гадоў.

Увогуле, музей дае поўнае ўяўленне пра тое, як і чым жыў легендарны авіяканструктар. Дзякуючы дасціпнасці Валерыя Аляксеевіча, адчуваеш водары, якія напаўнялі дом Сухіх, чуеш гукі, можаш пагартаць першыя кнігі будучай зоркі авіяцыі і ўбачыць, у чым яго жонка выходзіла ў свет.

**Ганна КУРАК.**
**Фота аўтара і з архіва ГДТУ імя П. В. Сухога.**
*Мінск — Гомель — Мінск.*



Сямейства Сухіх у Гомелі. Соф'я і Павел стаяць. 20-я гады.

### Дарэчы

### Беларускія адрасы Сухога

Будучы авіяканструктар нарадзіўся ў горадзе **Глыбокае** на Віцебшчыне. Сёння там у сярэдняй школе № 1 (яна носіць імя авіяканструктара) працуе музей, на алеі знакамітых землякоў стаіць помнік Паўлу Восіпавічу, а пры ўездзе ў горад устаноўлены самалёт СУ-17.

Самым незвычайным помнікам Сухому лічыцца той, што знаходзіцца ў **Лунінцы** (Брэсцкая вобласць). Бюст быццам «ляціць» на двух гранітных крылах.

У **Гомелі** памяць пра Паўла Восіпавіча ўвекавечылі адразу ў некалькіх месцах: на праспекце Леніна стаіць бюст, побач з уваходам у ГДТУ — барэльеф з вывай. Найбліжэйшым часам каля ўніверсітэта плануюць установіць на пастаменце адзін з самалётаў, распрацаваных канструктарскім бюро П. В. Сухога.

# «ДЗЕЦІ — РАДАСЦЬ І КАЛАСАЛЬНЫ СТЫМУЛ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Вы пазнаёміліся ў Вялікім тэатры Расіі, дзе абодва служылі. А калі зразумелі, што прабегла тая самая іскра?..***

**Міхаіл Панджавідзэ:** — Усё кажуць аб гэтай іскры, але нічога паміж намі не бегала. Не было ніякіх узрушэнняў! Каця ў Вялікім тэатры Расіі працавала з пятага курса кансерваторыі, а я прыйшоў стажорам. Даў сабе зарок: пакуль не буду ў штаце тэатра — ніякіх інтрыжак або раманаў! А калі мяне прынялі на работу, то Каця аказалася першай жанчынай, на якую я сур'езна звярнуў увагу. Усё было вельмі спакойна: пагутарылі, закахаліся, я заляцаўся, а потым, як мае быць, пайшоў да Каціных бацькоў — сватацца. Праўда, мы шмат гадоў пражылі без штампаў у пашпартах, проста не было калі ўладзіць гэтую фармальнасць. Так што 11 гадоў — гэта афіцыйная лічба, а рэальная — 20.

***— У вас абодвух гэта другі шлюб, у кожнага на момант вашай сустрэчы ўжо было дзіця. Гэта не ўскладняла адносіны?***

**Кацярына Галаўлёва:** Не, дзеці неяк адразу сталі агульнымі.

***— Прапанова перабрацца ў Мінск была для вас нечаканай?***

**М. П.:** — У пэўнай меры, так. Спачатку мяне запрасілі зрабіць адну пастаноўку, гэта была опера «Набука». Тады тэатр толькі адкрыўся пасля працяглай рэканструкцыі, і мне было цікава паспрабаваць усе сучасныя тэхнічныя магчымасці, якія толькі з'явіліся ў беларускім Вялікім. А пасля паспяховай прэм'еры атрымаў запрашэнне ў Мінск...

***— Лёгка адважыліся на пераезд?***

**М. П.:** — За 15 гадоў, вядома, прывык да Вялікага ў Маскве. Але сам па сабе пераезд не быў праблемай. Напэўна, было складана вырашыцца памяняць уклад жыцця. Але адаптацыя прайшла хутка, і ў Мінску я адчуваю сябе досыць камфортна. Складаней было сыну — Сярожу на той момант споўнілася 13 гадоў, у Маскве ў яго засталіся сябры, напачатку ён нават ездзіў да іх на выхадныя. Цяпер у яго сябры і там, і тут.

**К. Г.:** — У Маскве заўсёды марыла працаваць у Вялікім. На гэты конт можна гаварыць шмат пафасных слоў, але не апошнюю ролю адыгрывала тое, што мне было зручна дабірацца да тэатра на метро. *(Усміхаецца.)* На момант запрашэння Міхаіла ў Мінск мяне нішто не стрымлівала ў Маскве: у тэатры для мяне практычна не было работы. А жыць на дзве краіны няпроста. Мінск мне спадабаўся адразу — утульны, прыгожы і спакойны горад. А ў беларускім Вялікім і тады быў дастаткова насычаны рэпертуар, і цяпер ён застаецца багатым.

***— Раскажыце, чым займаюцца вашы старэйшыя дзеці?***

**М. П.:** — Маша працуе ў Маскве. Два гады вучылася на рэжысёра, а потым сказала: не жаночая гэта справа! Цяпер яна займаецца арганізацыяй гарадскіх свят, на ўсіх этапах — ад задумы да ўвасаблення. Вырашыла вучыцца на прадзюсара. Пытаюся ў дачкі: «Маша, прадзюсар — хіба жаночая прафесія?» Адказала: прадзюсары сусальна жанчыны, а рэжысёры — мужчыны... Маша выйшла замуж, але пакуль я яшчэ не дзед.

Сярожа атрымаў вельмі добрую адукацыю ў Беларусі — у ліцэі пры Акадэміі музыкі. Потым ён вучыўся на акцёрскім у Акадэміі мастацтваў, але забраў дакументы, калі яго не перавялі на бясплатнае навучанне. Хлопец ён творчы, цяпер спрабуе сябе як эстрадны співак і аранжыроўшчык. Тым не менш з сынам у мяне была сур'ёзная размова. Я прама сказаў яму: калі ў верасні ён паступае вучыцца, прычым свядома, а не для таго, каб «адкасіць» ад арміі, то я яму дапамагаю матэрыяльна. Калі не, значыць, пераходзіць на самазабеспячэнне ці ідзе служыць. У 21 год хлопец не павінен сядзець на шыі ў бацькоў! Каця, вядома, са мной не згодная...

**К. Г.:** — Калі б Сярожа мог служыць у Беларусі, то я не была б так катэгарычна супраць арміі. У сына расійскае грамадзянства, і я баюся, каб ён не апынуўся ў якой-небудзь «гарачай» кропцы. А ў тым, што трэба або вучыцца, або працаваць, вядома, падтрымліваю мужа.

***— Давайце пагаворым аб вашай малодшай дачушцы. Колькі ёй гадоў?***

**М. П.:** — Сашачцы пяць з паловай, ужо цяпер бачу ў ёй цікавую асобу. Пакуль ходзіць у садок. З наступнага года аддам займацца ў музычную школу і на харэаграфію. А вось з агульнаадукацыйнай школай — пытанне. Мы не ўпэўнены, што ў шэсць гадоў трэба ісці вучыцца. Па-мойму, ёй яшчэ хочацца гуляць. І потым: да каго яна патрапіць? Як гэта магчыма загадзя даведацца? Нельга ж выбраць ні педагога, ні школу, — усё па рэгістрацыі. Я баюся, што дачка трапіць да настаўніка старой загартоўкі, які можа «паламаць» дзяцей, перастваараючы ў зручных для сябе. Зламаць, ведаеце, лёгка, а вось як потым скласці? Або будзе патрабаваць, каб кожнае дзіця ўдзельнічала ў прадметных алімпіядах, збірала тоны макулатуры і г. д. Так што пакуль, думаю, абмяжуемся музыкай — там з малымі займаюцца ў гульнявой форме. Я вось яшчэ разважаю аб вывучэнні замежных моў. Нас у школе вучылі граматыцы, але мы не ўмелі размаўляць. Вусную гаворку потым прыйшлося наганяць ужо ў дарослым жыцці. Ці магчыма наогул у школе вывучыць хоць бы азы замежнай мовы?..

**К. Г.:** — Мы ўжо сутыкаліся з тым, што дзяцей у школе падзяляюць па паспяховасці, па сацыяльным статусе бацькоў і матэрыяльным становішчы сям'і. І іх гэта траўмуе. Таму мы разглядаем варыянт дыстанцыйнага навучання. У пачатковай школе простая праграма, так што пры неабходнасці зможам дапамагчы. Саша — гіперактыўнае дзіця, у школе ёй будзе цяжка высядзець 40 хвілін, склаўшы рукі на парце. Нам не хочацца пазбаўляць дачку дзяцінства.



***— Аляксандра з'явілася, калі вам было ўжо за сорак... Кажуць, што познія дзеці амаладжваюць бацькоў?***

**М. П.:** — Адказнасці пасля сарака больш, чым у маладыя гады. Гэта не выпадковыя, а жаданыя дзеці. Мы ўжо былі прафесійнымі бацькамі! Дзеці — радасць і каласальны стымул для жыцця. Няважна, як ты сябе адчуваеш, але ў сем раніцы трэба ўстаць, сабраць дачку ў садок. Маленькае дзіця прымушае трымацца бадзёра.

**К. Г.:** — Пасля спектакля няма сіл нават размаўляць, не тое што гуляць. Але дзіця не павінна гэтага адчуваць. Толькі калі сама стала мамай, зразумела, што і маім бацькам часам было не да маіх «чаму, пагуляй, пачытай», але яны ніколі ад мяне не адмахваліся. Сям'я, мне здаецца, і трымаецца на зносінах — ці то чытанне казкі, ці то абмеркаванне, як правесці выхадныя.

***— Кацярына, а спраўляцца з хатнімі справамі вам хто-небудзь дапамагае?***

**К. Г.:** — Часам да нас прыязджаюць мая або Мішына мама. Бабулі любяць песціць унукаў, што-небудзь смачненькае прыгатаваць. А калі вы пытаеце пра домработніцу або пастаянную няньку, то гэта не наш выпадак. У нас не бывае вэрхалу, але і вось так, як я люблю, каб усё было на сваіх месцах, ніадоўга трымаецца. Калі Саша сваволіць з сабакам, а ў нас бардоскі дог, то цацкі раскіданыя па ўсёй кватэры. І гэта нармальна, таму што дом — гэта тое месца, дзе людзям камфортна, а не нейкая стэрыльная тэрыторыя.

**М. П.:** — Каця выдатна гатуе! Прычым складаныя стравы, да якіх многія жанчыны нават баяцца падступіцца. Калі Каця гатуе боршч, то сапраўдны! А які цудоўны плоў! Усе сябры, якія бываюць у нас у гасцях, кажуць, што ў жонкі цудоўная кулінарная інтуіцыя. Яна не глядзіць у рэцэпт, а нейкім толькі ёй вядомым спосабам адгадвае ідэальныя прапорцыі прадуктаў, спецый.

***— Напэўна, раніцамі песціце сям'ю смачнымі снеданкамі?***

**К. Г.:** — Рэжым дня ва ўсіх настолькі розны, што разам снедаць і нават вячэраць ніяк не атрымліваецца. Усе гэтыя складаныя стравы я гатую толькі ў выхадныя, у звычайныя дні — усё спрашчаецца. Часам у кафэ сілкуемся, купляем што-небудзь у кулінарных аддзелах, — як атрымліваецца. Сярожка, дарэчы, добра гатуе. У шчасце, сям'я ўсёедная, непераборлівая.

***— Міхаіл Аляксандравіч, вас запрашаюць іншыя тэатры для пастаноўкі спектакляў. На колькі звычайна прыходзіцца з'язджаць і ці паспяваеце замаркоціцца?***

— Камандзіроўка доўжыцца не менш за месяц, і, вядома, сумую па сям'і. Як гаворыцца, разам цесна, а паасобку — сумна. Балазе, сучасныя сродкі сувязі дазваляюць і чуць, і бачыць родных.



***— Кацярына, зазірнула ў ваша дасье: там зусім мала гастроляў. Не любіце ездзіць?***

— Ездзіць, глядзець свет я якраз люблю. Гэта добра ў адпачынку з сям'ёй. А гастролі — гэта іншае. Не магу сказаць, што я такая неспакойная мама, якая кожную хвіліну будзе тэлефанаваць дзіцяці, але, калі еду, сэрца не на месцы: а як там яны?.. Нашы бацькі ў тым узросце, калі яны могуць дапамагчы, але не ўзваліць на сябе дом і дзяцей. Значыць, трэба на час гастроляў запрашаць няньку. У выніку я нервуюся ўсю паездку, а зробленыя грошы павінна аддаць няньцы. Так што ў гэтым няма сэнсу. Я люблю спяваць, люблю сцэну, але, напэўна, я не кар'ерыстка. Калі можна адмовіцца ад гастроляў, я адмоўлюся дзеля сям'і. І гэта ніякая не ахвяра — гэта мой выбар.

***— Міхаіл Аляксандравіч, нядаўна вас віншавалі з 50-годдзем. Такі юбілей — нагода падвесці нейкія прамежкавыя вынікі. Вы задаволены тым, як склалася асабістае жыццё?***

— Я выхоўваўся на пэўных каштоўнасцях. Напрыклад, павінен быць адзін шлюб. Прычым не ўхваляўся ні ранні шлюб, ні позняя дзеці... Але ў мяне — усё не «па сцэнарыі». Два шлюбы, першае дзіця з'явілася рана — у 20 гадоў, апошняе — позна, у 45... Так, бацькоўскія наказы — правільныя. Але гэта не адмаўляе таго, што я шчаслівы, бо са мной — Каця і нашы дзеці. Калі б жыццё склалася па правілах — яно было б іншым.

* * *

**Творчае жыццё Панджавідзэ-рэжысёра таксама ўдалося. Дзякуючы пастаноўкам Міхаіла Аляксандравіча беларуская опера ажыла, яго спектаклі даўно заваявалі сэрцы публікі... Міхаіл Панджавідзэ — уладальнік медаля Францыска Скарыны, лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. За пастаноўкі ў іншых тэатрах рэжысёр таксама ўдастоены высокіх узнагарод, сярод іх — Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Татарстан.**

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
**Фота Міхаіла НЕСЦЕРАВА.**

## Информация о выплате дивидендов по акциям

Открытое акционерное общество «Строительный трест № 4», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17 настоящим информирует, что общим собранием акционеров Общества от 29.03.2019 года принято решение о выплате дивидендов акционерам Общества.

Размер дивидендов на одну акцию составляет 0,739556 руб.

Установлен следующий порядок выплаты дивидендов:

– выплата дивидендов на акции, приходящиеся на долю собственности г. Минска, не позднее 22 апреля 2019 г.;

– на акции, принадлежащие физическим лицам в срок до 31.05.2019.

Телефон для справок +375 17 334 33 64.

УНП 100055368

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 25.04.2019 повторного открытого аукциона

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 700/С-50305 – здание производственного корпуса, пл. – 857,4 кв. м.

***Начальная цена продажи: 122 300,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 12 230,00 бел. руб.***

Лот № 2. Изолированное помещение с инв. № 700/D-148770 – помещение № 2, пл. – 534,3 кв. м.

***Начальная цена продажи: 98 420,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 9 842,00 бел. руб.***

Лот № 3. Изолированное помещение с инв. № 700/D-148771 – помещение № 3, пл. – 1009,7 кв. м.

***Начальная цена продажи: 174 120,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 17 412,00 бел. руб.***

Лот № 4. Изолированное помещение с инв. № 700/D-148808 – помещение № 3, пл. – 469,5 кв. м.

***Начальная цена продажи: 76 310,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 7 631,00 бел. руб.***

Лоты №№ 1–4 расположены по адресу: **г. Могилев, Гомельское шоссе, 5** на земельном участке с кадастровым номером 740100000007004955. Отдельные земельные участки для обслуживания каждого из лотов не выделены

**Аукцион состоится 25 апреля 2019 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок (подаются лично) и внесения задатка: 24 апреля 2019 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

Расчетный счет для перечисления задатка: получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Продавец: ОАО «Могилевоблавтотранс», УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона: по лотам №№ 1–2 – 2 % от конечной цены продажи; по лоту № 3 – 1,5 % от конечной цены продажи; по лоту № 4 – 2,5 % от конечной цены продажи. Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 21.07.2018, 11.09.2018, 17.11.2018, 05.02.19

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375222 72-41-14, +37529 624-26-25**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества), в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 26 апреля 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 70 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | **Условие продажи: 1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Примечание:** в соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %** | | | |
| | **Местонахождение лотов №№ 2–4:** Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 46 | | | |
| 2 | Автомобиль МАЗ 6303 А5 СМБ-372- 20, рег. № АЕ 0719-3, г. в. 2009, цвет – белый, тип ТС – грузовой автобетоносмеситель | **4 860, 00** | 243,00 | 486,00 |
| 3 | Трактор ДТ-75 ДЕРС 2 с бульдозерным оборудованием, рег. № ЕА-3 9536, зав. № 739311, г. в. 2007 | **2 430, 00** | 121,50 | 243,00 |
| 4 | Кран козловой ткк-5 (инв. № 1-132а) | **4 830, 00** | 241,50 | 483,00 |
| 5 | Одноквартирный дом «лесника» (инв. № 1-27). **Местонахождение:** Гомельская область, Ветковский р-н, г. Светиловичи | **720, 00** | 36,00 | 72,00 |
| 6 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-16614** общей площадью **472, 3 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административное здание. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003856** общей площадью **0, 2299 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7, участок № 5. **Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для обслуживания подъездной автомобильной дороги (земельный участок для размещения объектов улично-дорожной сети общего пользования). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003853** общей площадью **0, 2216 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7, участок № 2. **Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для обслуживания административного здания с подъездной дорогой (земельный участок для размещения объектов административного назначения). **Подробный и полный перечень имущества по лоту № 6 опубликован в газете «Звязда» от 23.08.2018 г. № 161 (28777)** | **87 464, 10** | 4 373,21 | 8 746,41 |
| | **Местонахождение лотов №№ 7, 9-12:** Гомельская область, Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7 | | | |
| 7 | Котельная установка со вспомогательным оборудованием, 2010 г. в. (инв. № 953) | **250, 80** | 12,54 | 25,08 |
| 9 | Рама лесопильная вертикальная одноэтажная Р63-4Б, 2009 г. в. (инв. № 905) | **4 656, 00** | 232,80 | 465,60 |
| 10 | Станок вертикально-фрезерный ВФ-87. 1989 г. в. (инв. № 054) | **3 182, 70** | 159,14 | 318,27 |
| 11 | Станок продольно-фрезерный четырехсторонний мод. ВШ-160М-5СУ, зав. № 05005, 2005 г. в. (инв. № 844) | **6 662, 40** | 333,12 | 666,24 |
| 12 | Станция компрессорная стационарная электрическая винтовая ММЗ-03-СВЭ5, 6/0.7, 2009 г. в. (инв. № 903) | **1 800, 00** | 90,00 | 180,00 |
| 13 | **Капитальное строение с инв. № 322/С-17095** общей площадью **62,4 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **одноэтажное кирпичное здание весовой. Капитальное строение с инв. № 322/С-13278** общей площадью **530,1 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажный кирпичный навес под стоянку автомобилей. Капитальное строение с инв. № 322/С-17094** общей площадью **44,8 кв. м,** назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **одноэтажное кирпичное здание гаража для легковых автомобилей. Капитальное строение с инв. № 322/С-13275** общей площадью **1 621, 5 кв. м,** назначение – одноэтажное панельное здание материального склада, наименование – **одноэтажное панельное здание материального склада. Капитальное строение с инв. № 322/С-13272** общей площадью **776,3 кв. м,** назначение – одноэтажное кирпичное здание мехмастерских, наименование – **одноэтажное кирпичное здание мехмастерских. Капитальное строение с инв. № 322/С-13276** общей площадью **144,4 кв. м,** назначение – одноэтажное блочно-кирпичное здание склада, наименование – **одноэтажное блочно-кирпичное здание склада. Капитальное строение с инв. № 322/С-13274** общей площадью **267,8 кв. м,** назначение – одноэтажное кирпичное здание деревообрабатывающей мастерской, наименование – **одноэтажное кирпичное здание деревообрабатывающей мастерской. Капитальное строение с инв. № 322/С-13273** общей площадью **249,4 кв. м,** назначение – одноэтажное панельно-кирпичное здание деревообрезной мастерской, наименование – **одноэтажное панельно-кирпичное здание деревообрезной мастерской. Адрес:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, д. 28. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100003002094** общей площадью **1,9669 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Сергея Кирова, 28. Ворота металлические (инв. № 44/373) | **122 195, 70** | 6 109,79 | 12 219,57 |
| 14 | **Капитальное строение с инв. № 322/D-14888** общей площадью **152,4 кв. м,** назначение – помещение транспортного назначения, наименование – **механические мастерские**. **Адрес:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, 28Б /2-1. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100003002091** общей площадью **0,0258 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Сергея Кирова, 28 | **5 190, 00** | 259,50 | 519,00 |
| 16 | **Капитальное строение с инв. № 322/С-13270** общей площадью **1 229,3 кв. м,** назначение – двухэтажное кирпичное здание по ремонту автотранспорта (мехмастерские), наименование – **двухэтажное кирпичное здание по ремонту автотранспорта (мехмастерские). Адрес:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, д. 28. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **32475010003002090** общей площадью **0,3696 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Сергея Кирова, 28. Сетка металлическая (инв. № 44/372). Бетонное покрытие производственной площадки (инв. № 44/322г) | **57 180, 00** | 2 859,00 | 5 718,00 |
| 17 | **Капитальное строение с инв. № 322/С-13279** общей площадью **783,6 кв. м,** назначение – двухэтажное кирпичное сооружение растворо-бетонного узла, наименование – **двухэтажное кирпичное сооружение растворо-бетонного узла. Адрес:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, д. 28. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100001004158** общей площадью **1,1910 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Сергея Кирова, 28. **Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей. Ограждение из ж/б плит базы ул. Кирова, 28 (инв. № 44/371) | **37 266, 00** | 1 863,30 | 3 726,60 |
| 18 | **Капитальное строение с инв. № 322/D-14890** общей площадью **74,0 кв. м,** назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – **проходной пункт. Адрес:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, д. 28Б/1-1. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100003002101** общей площадью **0, 0191 га (право аренды, доля в праве 4/5). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Сергея Кирова, 28Б | **4 410, 00** | 220,50 | 441,00 |
| 24 | Трактор ДТ-75 ДЕРС 2 с бульдозерным оборудованием, рег. № ЕА-3 7299, зав. № 737634, г. в. 2007. **Местонахождение:** Гомельская область, г. Добруш, ул. Крылова, 4 | **2 430, 00** | 121,50 | 243,00 |
| | **Местонахождение лотов №№ 27–30:** Гомельская область, г. Добруш, ул. Полевая, 4 | | | |
| 28 | Автомобиль МАЗ 543205-220, рег. № АА 6137-3, г. в. 2006, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **3 090, 00** | 154,50 | 309,00 |
